№ 40 (685) 27 кастрычніка 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**Усё пра кандыдатаў у прэзідэнты**

Старонка 8



**Беларуска заваявала Крэмль**

Старонка 13

**«Закон шкадуе педафілаў?»**

Старонка 6



### Напамін

**31 кастрычніка пераходзім на зімовы час.** Стрэлкі гадзінніка пераводзяцца на гадзіну назад. Гэта здарыцца ў ноч на 31 кастрычніка а 3-й гадзіне.

### У НУМАРЫ

**Дэвальвацыя рубля — пасля выбараў?**

За адзін жнівень дэфіцыт валюты склаў $0,9 мільярда. **Старонка 4.**

**Аўтар бел-чырвона-белай гісторыі**

Не стала Паўла Лойкі. **Старонка 5.**

**Краіна, дзе час спыніўся**

Рэпартаж з Прыднястроўя. **Старонка 10.**

**«Масакра» апраўдала чаканні**

Журналіст «НН» пабачыў стужку Кудзіненкі на прэс-паказе. **Старонка 11.**

**Глобуса не пусцілі ў Саюз мастакоў і ПЭН**

а Вольскага прынялі ў Саюз пісьменнікаў. **Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

# Лукашэнка і Грыбаўскайце: новы саюз

Годныя спарынг-партнёры. **Старонка 3.**



**На фота: Прэзідэнты і міністр замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс.**

## Беларускі эканамічны цуд

У передвыбарны год пенсіі растуць удвая хутчэй!

З 1 лістапада дапамога пенсіянерам падрасце прыблізна на 55 тысяч рублёў. Згодна з указам кіраўніка дзяржавы, з наступнага месяца ў краіне павялічваецца памер працоўных і сацыяльных пенсій. У сярэднім рост складзе 10%. Гэта каля 55 тысяч рублёў. Цяпер сярэдняя працоўная пенсія дасягне 611 тысяч рублёў — $204 у эквіваленце.

У дадатак указам усталёўваецца штомесячная даплата да сацыяльных пенсій дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідам усіх груп, а таксама дзецям, якія страцілі карміцеля, у памеры 40 тысяч.

Клопат дзяржавы пра пенсіянераў не можа не радаваць — дапамога ім узрастае ажно тры раз за год! «Наша Ніва» прааналізавала даты павышэнняў пенсій за апошнія пяць гадоў і заўважыла «дзіўную» тэндэнцыю. У передвыбарныя гады пенсіі растуць удвая хутчэй, чым звычайна. Чым не эканамічны цуд?

### Закон раіць чакаць лістапада

Згодна з законам «Аб пенсійным забеспячэнні», пераразлік пенсій у сувязі з ростам сярэдняга заробку ажыццяўляецца, калі яго рост склаў больш за 15%. Калі ж у краіне склалася цяжкая эканамічная сітуацыя і на працягу каляндарнага года не ўзнікае падстаў для пераразліку пенсій, з 1 лістапада пенсіі пераразлічваюцца ў абавязковым парадку.

Працяг на старонцы 4.

# Крывавая трагедыя ў Пінску

Эканомілі на бяспецы?

25 кастрычніка, каля 13-й гадзіны, у Пінску грымнуў выбух. Узарваўся цэх дрэваапрацоўчай фабрыкі ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў».

Сіла выбуху была такая, што ў цэху абваліўся каля 100 кв. м столі, былі разбураныя дзве сцяны. Жыхары Пінска некалькі гадзін бачылі над фабрыкай слуп чорнага дыму. Пяць разлікаў МНС здолелі ўтаймаваць агонь толькі каля 16-й.

Выбух забраў жыцці як мінімум трох чалавек. Адзін работнік фабрыкі загінуў адразу, цела другога знайшлі ўвечары пад заваламі пажарнікі, трэці памёр у бальніцы ад апёкаў.

Квартал вакол фабрыкі адразу па здарэнні ачапіла міліцыя. Супрацоўнікі мясцовага КДБ не пускалі на тэрыторыю нават дзяржаўных журналістаў. Брак інфармацыі спарадзіў чуткі, што ахвяр нашмат болей.

І сапраўды, усяго ў цэху ў момант выбуху было 29 работнікаў. 19 з іх моцна абгарэлі і былі шпіталізаваныя (з іх 14 — у рэанімацыі), целы двух знайшлі. Дзе яшчэ восем чалавек?

Тыя 14 атрымалі тэрмічныя апёкі 3 і 4 ступеняў на 60 % скуры, апёкі верхніх дыхальных шляхоў і лёгкіх. У аднаго з пацыентаў абгарэла 100 % цела. Самымі крытычнымі для апёкавых хворых лічацца першыя 72 гадзіны: пасля іх шанцы выжыць істотна павялічваюцца.

Некаторыя ахвяры здолелі выйсці самі праз прахадную завода. Аднаго з пацярпелых сустрэчны зняў мабільным тэлефонам на відэа: на чалавеку засталося абгарэлае шмаццё ад сінтэтычнай працоўнай адзежыны, ён мала што бачыць, асляплены выбухам, у яго шок.

Што ж так выбухнула ў цэху па вытворчасці паліўных гранул? Самі пацярпелыя казалі, што паравыя катлы. Аднак МНС трымаецца папярэдняй версіі пра «аб'ёмны выбух».

Працяг на старонцы 6.



**Абгарэлы работнік у шокавым стане ўцякае з фабрыкі.**

# Праваслаўныя не хочуць, і каталікі таксама

**Круглы стол перакладчыкаў біблійных і літургічных тэкстаў: цікава, але бясплённа.**

«Шмат традыцый — адна мова». Пад такім дэвізам у Грэка-каталіцкім цэнтры ў Мінску 22—23 кастрычніка адбылася сустрэча святароў, філолагаў, гісторыкаў, перакладчыкаў. Галоўнай задачай круглага стала было сабраць разам людзей, якія займаюцца пытаннямі перакладу біблійных і літургічных тэкстаў на беларускую мову.

Праблема ў тым, што праваслаўныя пераклад літургіі выконваюць асобна (і няспешліва), рыма-каталікі — асобна, пратэстанты — сабе, а грэка-каталікі даўно такі пераклад здзейснілі. Тое было подзвігам айца Аляксандра Надсана, апостальскага візітатара для беларусаў-каталікоў замежжа, у часе прыезду якога ў Беларусь і была арганізаваная сустрэча.

Пераклад Бібліі на старабеларускую мову пачаў Скарына яшчэ ў XVI стагоддзі. Але на новабеларускую мову агульнапрынятага перакладу пакуль няма.

Перакладалі яе Антон Луцкевіч і пратэстант Лукаш Дзекуць-Малей, пасля — Янка Станкевіч (ягоны пераклад зроблены адмысловым, высокім, архаічным стылем), яшчэ пасля, часткамі, — айцец Уладзіслаў Чарняўскі. Нарэшце з'явіўся вельмі ясны для сучаснага чытача пераклад Васіля Сёмухі. Дарэчы, апошні разышоўся вялікім для Беларусі 10-тысячным накладам. Але... І апошні праваслаўная і каталіцкая іерархіі не прызнаюць, бо яго рабіў не царкоўны дзеяч, не манах.

Да таго ж, даточваецца метадалагічны аргумент: і Станкевіч, і Сёмуха, і Луцкевіч пры перакладзе выкарыстоўвалі арыгінальныя мовы ці падрадкоўнікі і тлумачальнікі з іх (грэцкая, габрэйская, арамейская), але не былі дасканалымі знаўцамі або зусім не ведалі іх.

Разначытанні існуюць ва ўсіх перакладах, розняцца і літургічныя тэрміны. Каталікі моляцца Езусу, грэка-каталікі — Ісусу, праваслаўныя — Іісусу. Каталікі святкуюць Нараджэнне Хрыстова, праваслаўныя — Раджджаство.

І гэта толькі самыя агульныя прыклады. Між тым, ёсць і шмат драбнейшых тэрмінаў. Усё гэта не спрыяе нацыянальнаму адзінству.

Удзельніца сустрэчы, доктар багаслоўя Ірына Дубянецкая адзначае, што ў нас пабольшала кваліфікаваных спецыялістаў. На круглым стале сабралася больш за 40 чалавек: як царкоўных, так і свецкіх. Сярод іх былі прафесар Іван Чарота, паэт Юрась Пацюпа, старшыня Біблійнага таварыства Герман Родаў. Гаворка была цікавай, часам захапляльнай. Але...

Кіраўнік Біблійнай камісіі Беларускай парваслаўнай царквы а. Сяргей Гардун заявіў: нас задавальняе тое, што ёсць. Амаль тое самае, толькі ў мякчэйшых выразах, на наступны дзень выказаў рыма-каталіцкі біскуп Антоні Дзям'янка.

А гэта азначае, што ні Праваслаўная, ні Каталіцкая цэрквы не прагнуць выпрацоўкі адзінага варыянта тэрміналогіі, лічачы свой канон адзіна слушным.

**Мікола Бугай, Кастусь Матушыч**

## Дзяды. Наведайце магілы



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Сціcла

• **Лукашэнка не выключае ўвядзення абавязковага медыцынскага страхавання.** Пра гэта ён заявіў, наведваючы Цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі (Бараўляны).

• **Другі саміт Усходняга партнёрства адбудзецца ў маі 2011 года.** Кіраўнікоў краінаў ЕС, Украіны, Беларусі і Каўказа прыме Будапешт. Варта адзначыць, што на першы саміт Аляксандр Лукашэнка не паехаў. У гэты раз яго запросяць, толькі калі выбары ў краіне пройдуць свабодна.

• **Беларусь пазычыць яшчэ мільярд даляраў праз еўрааблігацыі.** Сплачваць тыя грошы прыйдзецца праз 5 гадоў.

• **Супраць выкладчыкаў гомельскага каледжа распачалі 228 крымінальных справаў.** КДБ падазрае, што муж і жонка, абое выкладчыкі, сістэматычна бралі хабар за здачу экзаменаў. Для кожнага існавала свая такса, у сярэднім ад 30 да 200 тысяч рублёў.

• **У Магілёве судзяць «фацінскага маньяка».** У сакавіку ў Магілёве ў раёне вуліцы Фаціна знайшлі два расчлянёныя жаночыя целы.

• **Пад Бялынічамі завядуць стронгу.** На рацэ Вабіч рыбаводную гаспадарку на 20 тон рыбы ў год будуе ААТ «ПМК-83 Вадбуд».

• **Пачатак лістапада чакаецца цёплы і даволі сухі.** Сярэднія тэмпературы ў бліжэйшыя два тыдні складуць ад +2 уначы да +10 градусаў удзень. На поўдні краіны будзе нават да +13.

• **БАТЭ — без двух тураў чэмпіён.** Барысаўскі клуб у заключным матчы 29-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе выйграў на сваім полі ў брэсцкага «Дынама» — 2:0. Брэсцкі клуб, дарэчы, трэніруе былы «коўч» БАТЭ Юры Пунтус.

БАТЭ набраў 65 балаў, у салігорскага «Шахцёра», які ідзе 2-м, 57 балаў.

Каб у сёмы раз у сваёй кароткай гісторыі — і пяты раз запар — БАТЭ заваявацъ залатыя медалі нацыянальнага чэмпіянату, у чатырох апошніх турах клубу дастаткова набраць пяць пунктаў.

**Турнірнае становішча пасля 29 тура:** БАТЭ — 65, Шахцёр — 57, Мінск — 54, Дынама Мінск — 50, Нафтан — 43, Белшына — 42, Дынама Брэст — 39, Дняпро — 36, Віцебск — 26, Нёман — 22, Тарпеда — 21, Партызан — 19.

**МБ; АГ**

### Самае чытанае на nn.by за 20—26 кастрычніка

- «Масакра» апраўдала чаканні
- Акадэмія навук: Беларусы — ніякія не балты і схільныя да глухаты
- Краіна, дзе час спыніўся
- Беларуская ўрадавая газета дала трыбуну палкоўніку Квачкову
- Лукашэнка Грыбаўскайце: Нам трэба думаць, як забяспечыць сваю незалежнасць
- Новы «Мульт асобы»: Лукашэнка просіць грошы на выбары
- Някляеў забяспечыць ЦВК празрыстымі скрынямі
- Дысбаланс на валютным рынку набыў трывожны маштаб
- Літоўскі журналіст: Грыбаўскайце паводзіла сябе так, як Лукашэнка
- Зянон Пазняк: «Абараніўшы гонар і годнасць, палюбім свабоду»

### nn@nn.by

Расейскае МЗС выказала заклапочанасць з нагоды выказвання беларускага прэзідэнта: «Мы выступаем за добрасуседскія адносіны з Кітаем».

**Кнехт**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Л.М., Я.С., Генадзю С. з Магілёва.
Паўлу А. з Гомельскага раёна.
Віталю Б., Д.М., А.Б., Марыі Ж., А.К., Я.Б. з Гродна.
С.В. з Баранавіцкага раёна.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
Аркадзю К. з Івацэвіцкага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Андрэю Н. з Полацка.
Аляксандру Р. з Полацкага раёна.
Івану Ф., Васілю Д. з Брэста.

# Лукашэнка Грыбаўскайце: Гэтыя выбары пройдуць не горш за папярэднія

Лукашэнка пабачыў у прэзідэнце Літвы годнага спарынг-партнёра.

20 кастрычніка Мінск наведала прэзідэнтка Літвы Даля Грыбаўскайце. Візіт можа не спадабацца Маскве.

Яна стала другім кіраўніком краіны Еўрасаюза, што прыязджалі ў Беларусь пасля замарожвання санкцый. Першым летась быў Сільвія Берлусконі.

З прэм'ер-міністрам Італіі Лукашэнку ўдалося знайсці супольную мову. Берлусконі нават быў выкарыстаны ў прапагандзе, калі заявіў, што беларускі народ любіць Лукашэнку і галасуе за яго на выбарах.

Чакаць ад Грыбаўскайце падобных заяваў не выпадала, але паездка напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў не магла не трактавацца як падтрымка дзейнай улады ў складаны перыяд. Між тым, Грыбаўскайце прадстаўляла не толькі Літву, але і ўвесь Еўрасаюз. Дарэчы, перш чым стаць прэзідэнткай, яна была еўракамісаркай па фінансах і бюджэце.

Літоўскі палітычны аглядальнік Кястуціс Гірнюс зазначыў, што візіт можа не спадабацца Маскве. «Калі Лукашэнка адчувае ціск, то візіт яму выгадны, нягледзячы на тое, што магчымая крытыка ў яго бок. Што Расіі гэта можа не спадабацца, то я таксама не сумняюся. Але калі Літва будзе празмерна старацца дагадзіць Маскве, то больш нашкодзіць сабе, чым выйграе», — зазначыў К.Гірнюс.

А ў чым жа была выгада для боку літоўскага? Літва зацікаўленая ў Беларусі незалежнай і сяброўскай.

### Дамова пра спрошчанае перасячэнне мяжы жыхарамі памежжа

стала канкрэтным вынікам візіту Грыбаўскайце. Літва падрыхтавала яе год таму, але беларускі бок не спяшаўся з падпісаннем. Ён унёс прапанову аб абавязковай рэгістрацыі літоўцаў, што прыязджаюць да нас. Толькі цяпер афіцыйны Мінск пагадзіўся на прапанаваны варыянт. Зрэшты, пакуль на словах, а як будзе з ратыфікацыяй — яшчэ вялікае пытанне. Краіны Еўрасаюза разглядаюць спрошчаны пераход мяжы як важны крок народнай дыпламатыі. Яны спадзяюцца такім чынам палепшыць сувязь простых беларусаў з Еўропай.

### Супольную АЭС Літва не хоча

Грыбаўскайце спаткалі на мяжы кветкамі. Потым яшчэ адзін букет ёй падарыў сам Аляксандр Лукашэнка, калі сустракаў на ганку Адміністрацыі. Беларускі лідар галантна правёў літоўскую калегу ў будынак пад парасонам.

Пра што ж гаварылі кіраўнікі дзяржаў? З падачы Лукашэнкі гаворка пайшла пра энергетычную бяспеку. «Мы знаходзімся ў неспрыяльных умовах, і нам трэба думаць аб тым, як забяспечыць сваю незалежнасць».

Галоўнае, што цікавіць Лукашэнку ў гэтым пытанні, — клайпедскі порт, які можна выкарыстоўваць для транзіту нафты і пабудовы тэрміналу для паставак звадкаванага газу.

Таксама Лукашэнка агучыў прапанову супольна пабудаваць беларуска-літоўскую АЭС у Астраўцы. Аднак літоўцы адкрыта заявілі, што такі праект немагчымы. Як сказаў прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубіліюс, «мы неадназова гаварылі беларускаму боку, што не гатовыя абмяркоўваць такія прапановы». А прэссакратар Грыбаўскайце адзначыў, што аб супольнай пабудове АЭС гаварыў толькі адзін Лукашэнка. Для рэалізацыі такога праекта патрэбны падабенства эканамічных сістэм і вялікая ступень даверу між краінамі, патлумачыў ён.

### «Зарэгіструем усіх, хто гэтага захоча»

А з ініцыятывы Грыбаўскайце размова зайшла пра хуткія выбары. Магчыма, што місія літоўскага прэзідэнта якраз і заключалася ў тым, каб давесці да афіцыйнага Мінска пасланне ЕС: для развіцця адносінаў выбары павінны быць дэмакратычныя.

«Беларусь імкнецца да таго, каб пасля выбараў ніхто пальцам на нас не паказваў. Дзейнаму прэзідэнту гэта зусім не трэба, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Паверце, зарэгіструем усіх, хто гэтага захоча». Зрэшты, не справа дзейнага прэзідэнта вырашаць, рэгістраваць усіх ці не ўсіх. Такія пытанні ў дэмакратычным грамадстве рэгулюе закон.

«Пасля выбараў мы спадзяёмся, што Беларусь стане больш адкрытай і будзе абараняць правы чалавека. Літва, як і Еўрасаюз, з надзеяй глядзіць на Беларусь і новыя выбары. Еўропа гатовая прызнаць адкрытасць выбараў, калі вы зможаце гэта прадэманстраваць», — сказала прэзідэнт Літвы.

На гэта Лукашэнка адказаў з двухсэнсоўнасцю, якую Грыбаўскайце магла ўспрыняць і як нахабства: «Гэтыя выбары пройдуць не горш за папярэднія. Хаця не ведаю, якія прэтэнзіі могуць быць да тых».

Мінулыя выбары не былі прызнаныя краінамі ЕС свабоднымі. Пасля іх Еўропа ўвяла супраць лукашэнкаўцаў санкцыі: за парушэнне правоў чалавека і рэпрэсіі супраць мірных грамадзянаў. Тыя санкцыі дзейнічаюць да сёння. У панядзелак 26 кастрычніка міністры замежных справаў Еўрасаюза чарговы раз падоўжылі іх на год. Але адначасова падоўжылі і мараторый на іх. На думку еўрадыпламатаў, сітуацыя ў Беларусі не палепшала, але і не пагоршала, і мараторый дае магчымасць кантактаў з Лукашэнкам. У той жа час мараторый не распаўсюджваецца на пяць асобаў. Чатыры з іх — сілавікі, якіх падазраюць у непасрэднай датычнасці да выкраданняў і забойстваў людзей: Віктар Шэйман, Уладзімір Навумаў, Юры Сівакоў, Дзмітры Паўлічэнка. Пятая — кіраўніца Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, якая ўвасабляе сістэму «элегантных перамог».

### Сустрэча з апазіцыяй

Цікавым бачыцца момант сустрэчы Грыбаўскайце з апазіцыйнымі кандыдатамі. Спачатку планавалася, што спатканне ў пасольстве Літвы правядзе міністр замежных справаў гэтай краіны Ажубаліс. Але да Кастусёва, Някляева, Раманчука, Рымашэўскага і Саннікава выйшла і сама Грыбаўскайце. Праўда, сустрэча была кароткай. Прычым літоўцы спазніліся на паўтары гадзіны! Гэтак зацягнуўся абед у Лукашэнкі.

Грыбаўскайце заклікала апазіцыю аб'ядноўвацца і вызначыць адзінага. Саннікаў і Раманчук адгукнуліся пра сустрэчу досыць скептычна. Уладзімір Някляеў увогуле сказаў, што апазіцыі нельга разлічваць ні на дапамогу Захаду, ні Расіі. А вось Рымашэўскі і Кастусёў пазітыўна ўспрынялі словы Грыбаўскайце.

Спатканнем з апазіцыяй прэзідэнт Літвы паказала, што пытанне правоў беларусаў застаецца на парадку дня. І адмаўляцца ад кантактаў з дэмакратычнай супольнасцю ніхто не будзе.



### Грыбаўскайце паводзіла сябе, як Лукашэнка

Рэпарцёр Літоўскага тэлебачання Вікінтас Пагачаўскас прысутнічаў на сустрэчы беларускага і літоўскага кіраўнікоў.

«Я не першы раз у Беларусі, не першы раз сутыкаюся з Аляксандрам Лукашэнкам, таму нічога новага ў яго-ных паводзінах не заўважыў. Ён быў досыць умераны, ніякіх гучных заяваў не рабіў. Тут мяне хутчэй здзівілі паводзіны прэзідэнта літоўскага.

Грыбаўскайце рэагавала на кожную фразу Лукашэнкі. Не імкнулася прамаўчаць некаторыя пытанні. Я пабачыў цвёрдага лідара, які адстойвае нацыянальныя інтарэсы. Думаю, што і Лукашэнка пабачыў у прэзідэнце Літвы годнага спарынг-партнёра, калі хочаце, нават апанента. Яна паводзіла сябе гэтак жа, як Лукашэнка. Гэта для мяне было самым моцным уражаннем.

Што датычыць сустрэчы з апазіцыяй, то вядома, што першапачаткова яна не планавалася. Магчыма, яе ўключылі пасля. І можа якраз таму, каб суцішыць дакоры, што Грыбаўскайце прыехала падтрымаць Лукашэнку».

**Зміцер Панкавец**

# Някляеў забяспечыць ЦВК празрыстымі скрынямі

Празрыстыя выбары — аснова дэмакратычнасці, лічыць кандыдат Уладзімір Някляеў.

«Нам гавораць, што выкарыстанне празрыстых скрыняў для галасавання — вельмі дарагое. Мы правялі перамовы з парламентамі суседніх краін, і нам паабяцалі дапамагчы празрыстымі скрынямі. А мы, у сваю чаргу, гатовыя гэтыя скрыні давесці да Беларусі», — заявіў лідар кампаніі «Гавары праўду».

Палітык таксама ўкінуў сімвалічны бюлетэнь у першую празрыстую скрыню, усталяваную ля ГУМа. Да акцыі мелі далучыцца і іншыя кандыдаты, аднак зрабіў гэта толькі Мікола Статкевіч. Ён зазначыў, што «выкарыстанне празрыстых скрыняў не забяспечвае ад фальсіфікацый, аднак значна ўскладніць магчымасць падману».

Кіраўнік аргкамітэта ініцыятывы «За справядлівыя выбары» Сяргей Калякін лічыць, што важна, каб людзі бачылі празрыстасць выбараў. «Празрыстыя выбары — аўтаматычная параза для ўлады і гарантыя перамогі дэмакратычнага кандыдата», — зазначыў ён.

Пасля гэтай акцыі Уладзімір Някляеў разам з супрацоўнікамі свайго штаба накіраваўся ў ЦВК, каб падаць скаргу на ініцыятыўную групу Аляксандра Лукашэнкі. Справа ў тым, што за Лукашэнку подпісы збіраюць людзі без адпаведных пасведчанняў, пад прымусам і па разнарадцы.

**Алесь Пілецкі**

### Сцісла

• **Цела Бябеніна пакуль не эксгумавалі.** Генпракуратура гатовая перадаць усе дакументы па справе Алега Бябеніна замежным экспертам. Спецыялісты АБСЕ з Нарвегіі і Швецыі прыбылі 25 кастрычніка ў Мінск для ўдзелу ў расследаванні абставінаў смерці журналіста сайта «Хартыя'97».

• **Міхалевіч папярэджвае пра фальсіфікацыі з прыёмам подпісаў.** Палітык падаў заяву ў ЦВК з просьбай зрабіць прыём сабраных подпісаў больш празрыстым. «Неабходна, каб улічвалася не толькі колькасць лістоў, але і колькасць подпісаў, — мяркуе Міхалевіч. — Інакш ствараецца глеба для магчымых злоўжыванняў і фальсіфікацый».

• **Беларускай хрысціянскай дэмакратыі зноў адмовілі ў рэгістрацыі.** Міністэрства юстыцыі адмаўляе партыі ўжо трэці раз.

**ЗП**

# Беларускі эканамічны цуд

Працяг са старонкі 1.

Досвед папярэдніх гадоў кажа, што закон выконваецца далёка не заўсёды. Напрыклад, летась пенсіі ўзраслі ўсяго на 9,5%, хоць заробак у той час падняўся больш чым на 20%. Так што рост пенсій — перадусім воля дзяржавы.

### Жыць бы заўсёды ў перадвыбарныя гады…

З пачатку 2005 года пенсіі ў Беларусі раслі 13 разоў. З іх ажно шэсць павышэнняў прыйшлося на два перадвыбарныя гады. Па дзіўным супадзенні, у іншы час рост пенсій хвалюе ўладу нашмат менш...

| Прамежак часу | Колькасць павышэнняў | Рост за год у % |
|---|---|---|
| 19.03.2005—18.03.2006 | 3 | 33% |
| 2006 | 2 | 19% |
| 2007 | 2 | 18% |
| 2008 | 2 | 18% |
| 2009 | 1 | 9,5% |
| 2010 | 3 | 35% |

Але галоўнае не колькасць павышэнняў, а «якасць». На колькі працэнтаў пенсіі выраслі за год? Тут перадвыбарныя 2005 і 2010 гады б'юць усе рэкорды — 33% і 35% росту адпаведна. Прытым што за астатнія гады сярэдні паказчык не перавышае 19%, нават калі не браць пад увагу відавочна правальны крызісны год.

Пачынаючы ад 2006 года, тэмпы росту пенсій штогод запавольваліся. Каб зноў «грымнуць» у перадвыбарны 2010 год. Сёлета дапамога вырасла ўжо тройчы. Шчаслівымі для пенсіянераў сталі студзень, жнівень і лістапад.

### Кожны месяц каштуе $45 мільёнаў

На колькі збяднее бюджэт, каб даплаціць усім пенсіянерам краіны? Штомесяц прыйдзецца выдаткоўваць дадатковыя $45 мільёнаў. Па словах намесніцы міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Каралёвай, у апошні час на выплаты пенсій ішло 10% ад ВУП краіны.

**Яўген Васількоў**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Дысбаланс на валютным рынку набыў трывожны маштаб

За адзін толькі жнівень дэфіцыт валюты склаў $0,9 мільярда.

У студзені—жніўні ў Беларусі было прададзена $37,6 мільярда, а куплена $41,3 мільярда. Такім чынам, па выніках васьмі месяцаў склаўся чысты попыт на замежную валюту ў памеры $3,7 мільярда. Прычым асабліва актыўна дэфіцыт рос у жніўні.

Попыт на даляры і еўра на Беларускай валютна-фондавай біржы (БВФБ) пастаянна перавышае прапанову. Гэты дысбаланс зразумелы, бо апошнія гады краіна экспартуе менш, чым імпартуе. Розніцу пакрывалі замежныя крэдыты і сродкі ад прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

Эксперты чакаюць, што да канца года перавышэнне попыту на валюту над прапановай будзе ўзрастаць. Гэта звязана як з сезоннымі ваганнямі імпарту, так і з ростам у пачатку наступнага года цэнаў на расійскі газ мінімум на 10%.

Далейшы рост дэфіцыту валюты прывядзе да яшчэ большага ціску на золатавалютныя рэзервы. Менавіта за кошт іх Нацбанк вымушаны кампенсаваць дэфіцыт замежнай валюты, заначаюць аналітыкі.

На піку фінансавага крызісу ў 2008 годзе дэфіцыт бягучага рахунку дасягаў маштабаў, сувымерных з цяперашнімі. Гэта робіць змену фінансавай палітыкі непазбежнасцю. Пытанне толькі ў часе.

Можна чакаць прыняцця ад уладаў нейкіх надзвычайных мераў для аднаўлення стабільнасці. Гэта можа быць пачатак новых перамоваў з Міжнародным валютным фондам або прыватызацыя аднаго з буйных дзяржаўных прадпрыемстваў нафтахіміі ці «Беларуськалія». Або — што найменш імаверна — значнай дэвальвацыі рубля. Хоць маштаб праблемы стаў такі, што і гэтага апошняга варыянта ўжо няможна выключаць.

**Андрэй Арэшка, БелаПАН; Сяргей Гезгала**

# Тур супраць Раманчука — чыя праграма экстрэмісцкая?

Прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду і намеснік міністра эканомікі сышліся ў завочнай спрэчцы.

Адказваючы на пытанні журналістаў, намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур расказаў пра сваё стаўленне да праекта эканамічнай праграмы прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Ярослава Раманчука. «Раманчук з'яўляецца прыхільнікам выключна ліберальнага тыпу эканомікі. Ён узначальвае Цэнтр Мізеса, а Мізес — чалавек з плеяды архінеалібералаў, у якіх дзяржава не прысутнічае практычна нідзе, яна з'яўляецца тормазам і перашкаджае развіццю эканомікі. Усе неаліберальныя праграмы носяць экстрэмісцкі характар, якія праяўляецца ў тым, што асобныя палажэнні вядуць да выключэння або супярэчнасці адно да аднаго. Раманчук ніколі не працаваў у органах дзяржкіравання і не мае базавай эканамічнай адукацыі. Гэта не азначае, што ён не можа разбірацца ў эканоміцы. У яго не было магчымасці паўдзельнічаць у выпрацоўцы сапраўдных рашэнняў, і ў гэтай частцы праграма вельмі экстрэмісцкая», — заявіў Тур.

Прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду паспяшаўся адказаць намесніку міністра эканомікі на заяву аб экстрэмізме. «Андрэй Тур, на жаль, настолькі зросся з чыноўніцкім крэслам, што забыў і эканамічную тэорыю, і тым больш эканамічную практыку, — мяркуе Раманчук. — У Беларусі сапраўды шмат эканамічнага экстрэмізму, але яго крыніца знаходзіцца ў Адміністрацыі прэзідэнта і Савеце Міністраў». Наяго ную думку, праявай экстрэмізму ёсць тое, што Беларусь знаходзіцца на 150-м месцы паводле ўзроўню эканамічнай свабоды, мае самае кепскае ў свеце падатковае заканадаўства і дагэтуль не ўступіла ў СГА.

**ЯВ**

# Італьянцы спалохаліся канкурэнцыі?

Фірма Baldinini заявіла, што беларуская «Марка» самавольна капіюе іх прадукцыю.

Аб сумесным абутковым праекце віцебскай кампаніі «Марка» і італьянскай Baldinini было заяўлена каля года таму. Гаворка ішла аб выпуску ў Беларусі больш танных аналагаў вядомай італьянскай маркі. Першыя боты ўжо з'явіліся ў крамах, калі італьянскія партнёры раптам заявілі, што да праекта не маюць дачынення, а беларусы самавольна капіююць іх прадукцыю.

Генеральны дырэктар СТАА «Марка» Мікалай Мартынаў запэўнівае, што супрацоўніцтва з Baldinini афармлена ў поўнай адпаведнасці з заканадаўствам. Гаворка ішла аб выпуску прадукцыі не пад маркай Baldinini, а пад іншай маркай — «Брава». Па яго словах, за калекцыю сезона восень—зіма 2010/11 было заплачана 150 тысяч еўра. Дадатковым пагадненнем прадугледжана, што Baldinini пастаўляе беларусам распрацаваныя ім мадэлі абутку, раскрой, чарцяжы, калодкі і ўзоры мадэляў, а тыя могуць выкарыстоўваць іх для ўласнай вытворчасці абутку. З італьянскага боку подпіс пад дакументам паставіў Джымі Бальдзініні.

Пры гэтым кіраўнік кампаніі Baldinini Джымі Бальдзініні заявіў, што ніякіх пісьмовых дамоўленасцяў паміж бакамі не было, і ён лічыць абутак, які вырабляецца кампаніяй «Марка» пад брэндам «Брава», падробкай пад Baldinini. «Копія, але някепская», — пракаментаваў італьянец. Пры гэтым ён адзначыў, што ніякіх судовых разглядаў ініцыяваць не збіраецца.

Што ж прымусіла італьянцаў адмовіцца ад супрацоўніцтва? «Напэўна, нас пачынаюць баяцца — абутак дакладна паўтарае італьянскую марку, але яго кошт да пяці разоў ніжэйшы. З'яўляецца канкурэнцыя», — лічыць Мікалай Мартынаў.

**ЯВ; Tut.by**

# Снапкоў пахваліў, Сямашка абурыўся

Расійская нафтавая прапанова збянтэжыла беларускіх чыноўнікаў.

Беларусь можа пагадзіцца пералічваць у расійскі бюджэт 100% экспартных мытаў на нафтапрадукты, калі Расія адмовіцца ад экспартных мытаў на нафту для Беларусі. «Як мы можам не пагадзіцца, калі ў аснове гэтай тэмы ляжаць роўныя ўмовы дзейнасці і рэалізацыі на экспарт нафты для беларускіх і расійскіх НПЗ? Мы ўдзельнічаем у перамовах па гэтым пытанні. Гэта і ёсць тое, да чаго мы імкнуліся», — адрапартаваў міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў.

Але радасць уласцівая далёка не ўсім беларускім чыноўнікам. Напрыклад, віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка лічыць пагадненне несправядлівым: «Для адзінай эканамічнай прасторы — нонсэнс уводзіць мыты на галёшы, валёнкі, нафту і нафтапрадукты». Пасля віцэ-прэм'ер перайшоў да лукашэнкаўскай рыторыкі: «Калі я адрываю ад бюджэту, укладваю грошы, даю заводам ільготы і прэферэнцыі, то чаму я павінен аддаваць гэтае мыта».

Адрозненні ў ацэнках падзеі могуць тлумачыцца поглядамі і схільнасцямі чыноўнікаў. Снапкоў вітае пераход эканомікі на рынкавыя рэйкі, у той час як Сямашка перадусім клапоціцца пра інтарэсы буйнога беларускага бізнэсу.

**ЯВ**


Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў.

## Сціслa

• **Незвычайная ідэя «Белнафтахіма».** «Белнафтахім» і запарожскае ТАА «НПИК «Зірка» прапаноўваюць перагружаць венесуэльскую нафту ў Адэсе з танкера на баржы і накіроўваць па Дняпры да Прыпяці, дзе трэба аднавіць рачны нафтатэрмінал «Жары» і нафтаправод да Мазыра. Абмеркаванне гэтага праекта ў дадзены момант працягваецца.

• **Кубілюс: Літва не будзе абмяркоўваць прапанову Беларусі пра АЭС.** «Мы неаднаразова гаварылі і беларускаму боку, што не гатовыя абмяркоўваць такія прапановы», — заявіў прэм'ер-міністр Літвы. «Для рэалізацыі такога праекта патрэбны падабенства эканамічных сістэм і вялікая ступень даверу між краінамі», — пацвердзіў прэс-сакратар Далі Грыбаўскайце.

• **Ангела Меркель: Еўра можна падтрымліваць толькі да 2013-га.** Канцлер Германіі мяркуе, што захады па ўтрыманні еўрапейскай валюты могуць працягвацца не больш за два гады. «Патрэбны механізм выратавання на працяглую перспектыву», — заявіла яна.

• **У Кітаі ствараюць цягнік, здольны ехаць з хуткасцю 500 км/г.** Ён стане самым хуткім у свеце. Ужо ў наступным годзе на лініі Пекін—Шанхай будзе выкарыстоўвацца новы цягнік, максімальная хуткасць якога дасягае 380 км/г.

• **Дабраліся да $434.** Паводле інфармацыі Белстата, сярэдні налічаны заробак у Беларусі склаў 1,305 мільёна рублёў. Гэта $434 у эквіваленце. За апошні месяц заробак падрос усяго на 18 000 рублёў — $6.

**ЯВ**

# Аўтар бел-чырвона-белай гісторыі

22 кастрычніка на 53-м годзе жыцця памёр гісторык Павел Лойка. Ён быў аўтарам першых з моманту здабыцця незалежнасці падручнікаў па гісторыі Беларусі. Пахавалі гісторыка на Міханавіцкіх могілках пад Мінскам 24 кастрычніка.

«Павел паходзіў з вельмі добрай беларускай сям'і са Слоніма, — успамінае пра сябра і калегу гісторык Валянцін Голубеў. — Яго дзеда, доктара, слонімцы памятаюць дагэтуль. Бацька Алег Антонавіч, наш паэт і пісьменнік, цудоўны чалавек. У Паўла былі моцныя беларускія карані. Ён яшчэ ў савецкія часы напісаў першы сапраўдны падручнік па гісторыі Беларусі. Настаўнікі плакалі ад шчасця, калі выйшлі тыя падручнікі. Як ён апісаў Аршанскую бітву! Толькі сёлета Мінадукацыі канчаткова выціснула тыя парасткі сапраўднасці з падручнікаў. А яны ж былі нацыянальныя, а не нацыяналістычныя».

**Сямён Печанко**



ЯРАСЛАЎ СЦЕШЫК

**Павел Лойка**

Нар. 12 ліпеня 1958 у Слоніме ў сям'і паэта, пісьменніка Алега Лойкі. Гісторык, кандыдат гістарычных навук. Працаваў у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Ад 1994 — загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ. Адзін з аўтараў, рэдактараў і складальнікаў школьных падручнікаў, навуковых зборнікаў і манаграфій па гісторыі.

## Спачуванні праз nn.by

Лойку любілі ўсе, ён быў безумоўным аўтарытэтам, нягледзячы ні на што. Дабрыня, спагадлівасць, шырокая натура, магутнасць, энергічнасць, запал, шчырасць. Такі нейкі караткевічаўскі дух... Будучыя гісторыкі вучыліся па яго займальных падручніках у школе, слухалі ягоныя, напоўненыя аптымізмам, рамантычнай узнёсласцю, трохі наівам, лекцыі на гістфаку, а потым па тых жа падручніках вучылі школьнікаў... У свае часы самая першая лекцыя на гістфаку сімвалічна была Лойкава. Яна ўмацоўвала першакурснікаў-гісторыкаў у правільным выбары шляху — мова, гістфак, Беларусь. Светлая памяць, Павел Алегавіч. Мы і цяпер ідзем тваёй дарогай і не забыліся на тваю ўсмешку.

**Сяржук Русецкі**

Ад імя гарадзенскіх калегаў-гісторыкаў выказваю спачуванне родным і блізкім, сябрам і калегам.

**Іна Соркіна**

Мае самыя шчырыя спачуванні родным! Вельмі прыкра, што памёр такі выдатны чалавек, не толькі як гісторык слаўны, але і як асоба — больш шчырага, добрага і ўсмешлівага чалавека цяжка сабе ўявіць. Вельмі балюча, што Вас не стала, шаноўны Павал Алегавіч!

**Арцём Дарэўскі**

Адзін з найлепшых выкладчыкаў у маім жыцці. Дзякую вам за ўсё, спадар Павал!

**Андрэй Кім**

У мяне ён, на жаль, нічога не выкладаў, але для ўсіх, каму пашанцавала, ён быў адным з найлепшых выкладчыкаў. Не кажучы пра тое, што яго паважалі і цанілі і як навукоўца. Шкада. Тым больш так рана... Вечная памяць і спачуванне сваякам.

**Алесь Пашкевіч, гісторык**

Добра памятаю лекцыі сп. Лойкі на першым курсе гістфака БДУ. Вечная памяць гэтаму выбітнаму чалавеку!

**Кастусь Ш.**

Вы былі файным выкладчыкам і добрым, сапраўдным ЧАЛАВЕКАМ. Шкада, што такія людзі так рана сыходзяць.... Шчырыя спачуванні родным, блізкім, калегам.

**Міхась Пашкевіч**

Не веру, не веру, не веру, не веру! Самы дарагі мне выкладчык на гэтым факультэце, чаму ён?! Памяць вам, мілы Павал Алегавіч, памяць вашых назаўжды верных вучняў...

**Сяргей Егарэйчанка**

Павел Алегавіч назаўжды застанецца ў нашай памяці. Хай зямля будзе табе пухам, мой сябра... Мае спачуванні Наташы, Надзеньцы і Алежку.

**Ігар Смоляр**

Чалавек жывы на зямлі, пакуль жывуць ягоныя справы. Вечная памяць!

**Наталля Сліж, Гродна**

Сапраўдны патрыёт! Спецыяліст, які любіў сваю справу. Шчырыя спачуванні ўсім родным і блізкім! Светлая памяць!

**Алег Сідарок, былы студэнт гістфака БДУ**

Вучылася на яго падручніках, кнігах сапраўднага асветніка Беларусі.

**Марыя Якаўцова**

Адзін з найлепшых выкладчыкаў... Апошні рамантык... Адраджэнец... Вечная памяць, Павел Алегавіч.

**Якаўцоў**

Вось ужо Паша прыдбаў абедзве даты сваёй прысутнасці ў гэтым свеце. Прысутнасці светлай для навакольных. Ён гітарыст, ён аўтааматар, які бліскуча кіраваў «жыгулёнкам» з нейкімі амаль не першымі ў Мінску і ад гэтага асабліва паважанымі нумарамі. Паважалі Паўла не толькі незнаёмыя праезджыя — за культуру на вуліцах роднага горада. Мінчукі (і не толькі) паважалі яго культуру беларуса-гараджаніна — бо ён ганаровы гараджанін-беларус minimum у трох пакаленнях. Цень славутага бацькі не засланяла Паўла, ён знайшоў свой шлях, сваіх сяброў, сваіх вучняў, напісаў свае кнігі — ён знайшоў сябе. Я з горкім пачуццём развітваюся з сяброўскім зваротам — Паша — і з пашанай і павагай кажу: вечны спакой Табе, дарагі Павел Алегавіч Лойка!

**Мікола Нікалаеў, Санкт-Пецярбург**

# За крытыку ў блогу — бестэрміновы адпачынак

Бабруйскаму журналісту Дзмітрыю Растаеву выставілі ўльтыматум.

Кіраўніцтва газеты «Вечерний Бобруйск» прапанавала журналісту Дзмітрыю Растаеву, які супрацоўнічае і з мінскай «Белгазетай», напісаць заяву на адпачынак. Напярэдадні заснавальніка бабруйскай газеты Валянціна Сысоя выклікаў раённы ідэолаг Міхаіл Кавалевіч. Паказаў падборку раздрукоўак з блога Растаева і «Белгазеты», а потым заявіў: «Альбо Растаеў перастае друкавацца дзе-кольвек, акрамя як у вас, альбо самі разумееце...».

Прычынай раздражнення сталі публікацыі, прысвечаныя выбарам. У артыкуле «Ці ёсць жыццё ў гіперкубе», надрукаваным у «Белгазеце», Дзмітрый Растаеў распавёў пра Святлану Абрамнікаву, прыбіральшчыцу з «Белшыны», якая запісалася ў ініцыятыўную групу Віталя Рымашэўскага. Намеснік гендырэктара «Белшыны» па ідэалагічнай працы Аляксандр Казлоў намякнуў ёй, што непажадана сумяшчаць працу на дзяржпрадпрыемстве і сяброўства ў БХД. У сваім блогу Д.Растаеў таксама неаднаразова крытыкаваў чыноўнікаў.

Кіраўніцтва «Вечернего Бобруйска» было вымушана «папрасіць» Растаева пайсці ў бестэрміновы адпачынак, бо ён адмовіўся спыніць супрацоўніцтва з «Белгазетай» і пісаць у блог.

«Яны паднявольныя людзі. З імі подла паступілі чыноўнікі, выклікаўшы не мяне асабіста, а маё начальства, прымусіўшы іх ціснуць на мяне», — каментуе сітуацыю Д.Растаеў.

Валянцін Сысой прызнае факт уціску з боку гарадскіх уладаў: «Але мы не маем выбару — у нас на рахунку сёлета ўжо ёсць адно папярэджанне Мінінфармацыі, нашы журналісты акрэдытаваныя пры гарвыканкаме».

Спроба атрымаць тлумачэнні ў Міхаіла Кавалевіча скончылася няўдачай. Як толькі чыноўнік пачуў прозвішча Растаева, ветлівы голас замяніўся на металічны: «Ніякіх каментароў я вам не дам. Званіце яму, яго рэдактару. А я нічога не скажу».

Пакуль Дзмітрый Растаеў спадзяецца, што яго адпачынак скончыцца пасля выбараў. Але спыняць публікацыю вострых матэрыялаў не збіраецца.

**Алесь Пілецкі**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

**Прашу Рэдакцыю падзякаваць падпалкоўніку Казлову.** Скажыце яму, што ён сапраўдны чалавек. Я ўражаны ім.

**Чытач з Мінска**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць дописы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Гудбай, гастролька

Лібералізацыя канцэртнай дзейнасці.

З 1 студзеня 2011 года афіцыйна адменяць «гастрольнае» пасведчанне, без якога ў Беларусі немагчыма арганізаваць канцэрт ні замежных, ні айчынных музыкаў.

«Наяўнасць гастрольнага пасведчання не сугучна нашаму часу. Канцэртны рынак выспеў і стаў цывілізаваны, — кажа Уладзімір Шаблінскі, дырэктар канцэртнага агенцтва «Лінія гуку». — На пачатку 2000-х ён поўніўся лжэпрадпрымальнікамі, якія давалі анонс канцэрта, прадавалі квіткі, а канцэрта не было. Праз гэта і былі ўведзеныя гастрольныя пасведчанні».

«Аналагаў сістэмы «гастрольных пасведчанняў» няма нідзе, — адзначыў Яўген Уладзіміраў, дырэктар і прадусар Джаз-Саўнд-Клуба. — Існаванне «гастролькі» — несправядлівасць, арганізатар павінен плаціць за спробу арганізаваць мерапрыемства!»

А што наконт ідэалагічнага кантролю, адным з інструментаў якога было гастрольнае пасведчанне? «Думаць, што зараз не змогуць забараніць канцэрт выканаўцы, які не падабаецца ўладам, — наіўна. Дастаткова пазваніць у клуб — і ўсё», — кажа кіраўнік лэйбла BMA-group Віталь Супрановіч.

Пастанова ўвойдзе ў сілу ў наступным годзе. Гэта значыць, да выбараў — усе канцэрты па ліцэнзіях.

**Юрась Ускоў, СМ**

# «Мы апярэджваем расейскамоўныя класы»

У Баранавічах, Гродне і Магілёве з'явіліся беларускамоўныя класы. Як прайшла першая чвэрць?

У Баранавічах беларускамоўны клас утварыўся дзякуючы сям'і Таццяны і Алега Малашчанкаў. Пазней да іх дачкі Ясі далучыліся яшчэ дзве дзяўчынкі: Аліса Філіпчык і Вераніка Міхальчук.

«Гэта нават лепш, што іх няшмат — індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці», — кажа Таццяна Малашчанка. Адзінае, што засмучае бацькоў, — англійская мова выкладаецца парасейску.

«Мы заўсёды гатовыя прыняць новыя заявы!» — запэўнілі ў школе №14.

Святлана Астроўская з Гродна першую чвэрць адвучылася адна. У 32-й школе частку заняткаў дзяўчынка наведвае сама, рэшту — з іншымі дзецьмі. «Ёй падабаецца! Каб можна было, то хадзіла б у школу і ў выходныя», — смяецца мама, Аксана Астроўская.

Ялінка Салаўёва з Магілёва, які Яся Малашчанка, пачынала вучыцца адна. Праз месяц да яе далучыліся Аляксей і Люба Уласавы. Мама дзяўчынкі Надзея Салаўёва цешыцца поспехамі дачкі і яе маленькага класа. Дзякуючы таму, што вучняў толькі тры, яны здолелі апярэдзіць аднагодкаў з расійскамоўных класаў. «Матэматыку ўжо за другую чвэрць вывучылі».

У Ялінкі няма праблемаў сацыялізацыі. «У групе падоўжанага дня многія дзеці пытаюць у яе, як пабеларуску будзе тое ці іншае слова».

Салаўёвы збіраюцца інфармаваць іншыя сем'і на бацькоўскіх сходах, сказала нам Надзея Салаўёва, мама Ялінкі.

**Сямён Печанко**

Пра ўмовы паступлення ў 1-я класы з беларускай мовай навучання звяртацца па адрасах:

Баранавічы, Піянерская, 98. Тэл.: (0163) 42-51-50, (0163) 42-51-50.

Гродна, Ліможа, 11. Тэл.: (0152) 43-64-03, (0152) 70-29-49.

Магілёў, Першамайская, 24. Тэл.: (0222) 31-07-85, (0222) 22-12-64.

# «Закон шкадуе педафілаў?»

**У справе маньяка «Бруднага» рана ставіць кропку.**

Генпракуратура заявіла, што следства па справе серыйнага маньяка-педафіла, які ў 1990-я трымаў у страху Мінск, працягнутае на некалькі месяцаў. Перад гэтым у прэсе з'явіліся паведамленні, што сталічная міліцыя спачатку затрымала падазраванага, даказала яго датычнасць да дзесяці згвалтаванняў, а пасля... адпусціла без суда па прычыне сканчэння тэрміну даўніны.

Справа «Бруднага» заблытаная. У прэсу трапілі ўрыўкавыя звесткі. Міліцыя шукала яго ад 1992 года. Яго ахвярамі былі дзяўчаткі ад 7 да 12 гадоў. Удалося даказаць дзесяць эпізодаў, аднак следчыя мяркуюць, што іх было сама мала пятнаццаць.

Першае з вядомых злачынстваў «Брудны» здзейсніў у верасні 1992 года, яму было тады 22. Апошняе зверства датуецца вераснем 1995-га.

Дзейнічаў ён схематычна: высочваў ахвяру, падманам трапляў да яе ў кватэру. Двойчы маньяк ледзь не папаўся: адзін раз у кватэры апынуўся бацька чарговай ахвяры, у другі — на яго напала аўчарка, пакінуўшы на назе шнары.

Увесь гэты час — ад пачатку жудаснай серыі і да нашых дзён — маньяк жыў у Мінску. Нібыта ён мае сям'ю, да апошняга працаваў у транспартнай кампаніі.

У справе ёсць белыя плямы — не паведамляецца, як следчым удалося затрымаць «Бруднага», ці абследаваўся ён у лякарні.

У артыкуле 83 Крымінальнага кодэкса гаворыцца, што тэрмін даўніны адлічваецца з дня здзяйснення злачынства да дня ўступлення ў законную сілу прысуду суда. Гэта дазваляе ўсумніцца ў праўдзівасці інфармацыі пра вызваленне «Бруднага» без суда.

Мінская пракуратура маўчыць, Генпракуратура абмежавалася кароткім адказам, што следства працягнутае на два месяцы. Тым часам паведамленне пра вызваленне маньяка па прычыне сканчэння тэрміну даўніны выклікала хвалю абурэння ў грамадстве.

Многіх абурыў сам факт, што беларускі закон прадугледжвае тэрмін даўніны па такім цяжкім злачынстве, як згвалтаванне. «Чаму ў нашай краіне за падатковыя злачынствы няма тэрміну даўніны, а за згвалтаванне ёсць? Закон шкадуе педафілаў?» — абураецца чытач на сайце «Нашай Нівы».

Людзей палохае і тое, што па вызваленні маньяк можа жыць сярод іх. Бо, паводле беларускіх законаў, да тых, у дачыненні каго спрацаваў тэрмін даўніны, нельга прыставіць нагляд. Узнікаюць пытанні: «Як быць ахвярам гэтага маньяка, якія ўжо падраслі і могуць мець сваіх дзяцей?»

У адказ агучваюцца прыклады заходніх краін. У прыватнасці, «Закон Меган» у ЗША, згодна з якім інфармацыя пра асуджаных гвалтаўнікоў дзяцей робіцца агульнадаступнай. Закон названы ў гонар 7-гадовай Меган Канка, якую згвалтаваў і забіў раней асуджаны за напад і спробу згвалтавання сусед дзяўчынкі. Бацькі Меган і іншыя суседзі не ведалі пра тое, хто жыве побач з імі.

У справе серыйнага гвалтаўніка «Бруднага» рана ставіць кропку. Але сама гэта справа прымушае задумацца пра дасканаласць нашага крымінальнага заканадаўства.

**Сямён Печанко**

**Генерал-маёр Тарлецкі пра вызваленага педафіла: Трэба пагартаць закон…**

Пра справу педафіла «Бруднага», якога выпусцілі з-за сканчэння тэрміну даўніны злачынстваў, распавёў былы начальнік ГУУС Мінгарвыканкама (1994—2001 гг.) Барыс Тарлецкі.

Я памятаю гэтую страшную гісторыю. Пацярпелыя дзеці ў адзін голас гаварылі пра смурод, якім тхнула ад гвалтаўніка, але, на жаль, яны не маглі даць дакладных прыкметаў маньяка. Паверце, мы выкарыстоўвалі ўсе магчымасці і зачэпкі. У адной з кватэр злачынец пакінуў запіску са сваім почыркам. Эксперты «выціснулі» з яе ўсё што маглі, правялі дзясяткі, а то і сотні параўнальных графалагічных даследаванняў.

Ён жа не кожны дзень здзяйсняў свае гідкія злачынствы. Рабіў брудную справу і знікаў на некалькі месяцаў. Я сёння маю інфармацыю, што ён пасля кожнага эпізоду ад'язджаў з горада.. На жаль, не ўсё, што здзяйсняецца злачыннага, удаецца раскрыць па гарачых слядах…

Я рады, што менская міліцыя яго затрымала. Ведаеце, сённяшні вынік быў закладзены яшчэ ў тыя гады, калі мы па драбках сабралі доказы. Цяпер яны спатрэбіліся.

Згвалтаванне малалетніх адносіцца да катэгорыі цяжкіх злачынстваў. Так, існуюць тэрміны даўніны. Але ж ёсць і нюансы! Трэба добра паглядзець закон, уважліва яго пагартаць…

**naviny.by**

## НАЙЛЕПШЫ ПА ПРАФЕСІІ




**Супрацоўнік аўтамыйкі разбіў чужы BMW X6. Адміністратар адной з мінскіх аўтамыек раніцай вырашыў пракаціцца на BMW X6, якую пакінуў кліент мыйні. Праўда, нябога апраўдваецца, што хацеў машыну заправіць. Ён ехаў запраўляцца з хуткасцю каля 110 км/г. Не даў рады кіраванню і ўехаў у дрэва. Адміністратар быў без правоў і выпіўшы. Зараз яму пагражае штраф, з яго злупяць грошы за рамонт аўто. А за згон пачалі крымінальную справу.**

## Крымінал сцісла

• **Скінулі ў Свіслач пяць лавак.** 22-гадовы і 24-гадовы мінчукі пасля застолля шпацыравалі ўздоўж ракі Свіслач. Лаўкі, якія стаялі на дарозе, яны адцягвалі да берага і скідалі ў ваду. Цяпер ім пагражае да 6 гадоў пазбаўлення волі за хуліганства. Да таго ж належыць кампенсаваць кошт пяці патопленых лавак — па 500 тыс. рублёў за кожную.

• **П'яны п'янага падбіў.** У Столінскім раёне п'яны кіроўца аўтамабіля збіў п'янага раварыста. Аварыя адбылася ўдзень на перакрыжаванні вуліц у вёсцы Хорск. Кіроўца машыны «Опель Мантэрэй» 45-гадовы жыхар вёскі Туры пры выездзе на галоўную дарогу даўся ў 25-гадовага аднавяскоўца на веласіпедзе. Кіроўца аўто затрыманы.

• **На мосце цераз Дняпро сутыкнуліся пяць машын.** Паводле папярэдняй версіі, дарога абледзянела, і легкавы «Форд» занесла і кінула ў парапет моста. Затым адзін за другім на вялікай хуткасці сутыкнуліся яшчэ тры аўто. І завершыў кампазіцыю аўтапоезд MAN. На шчасце, пацярпелых няма.

• **Жорсткая расправа з дзяўчынай.** У Вілейцы, ва ўласнай кватэры, знайшлі моцна скалечаную 18-гадовую дзяўчыну. Міліцыя падазрае яе 29-гадовага брата, раней чатыры разы судзімага. Яго затрымалі моцна п'янага, ён нічога не мог патлумачыць. У кватэры ў момант здарэння брат з сястрой былі ўдваіх.

• **Забіў бацьку.** 27-гадовы жыхар Асіповіцкага раёна падазраецца ў забойстве свайго бацькі. У адзін з дзён жніўня ў гаражы свайго 55-гадовага таты падчас сваркі малады чалавек застрэліў яго з паляўнічай стрэльбы, а цела пахаваў на ўчастку. Труп знайшлі. Падазраванага затрымалі.

• **У Мінску застрэлілі дырэктара аўтамабільнай кампаніі.** 57-гадоваму шэфу ТАА «Глобал Аўта Сіці» стрэлілі ў патыліцу. Вядома, што напярэдадні фірма прадала аўто. Дырэктар застаўся на ноч ахоўваць маёмасць.

• **У Пецярбургу разбіўся беларускі гастарбайтар.** 22-гадовы беларус зваліўся з 6-га паверха і ад атрыманых раненняў сканаў. Жыхар Магілёўшчыны Андрэй Марозаў у Пецярбургу жыў без рэгістрацыі.

• **Наркаман краў дарагія гадзіннікі.** 18-гадовы жыхар сталіцы цібрыў з гандлёвых цэнтраў камп'ютарную тэхніку і дарагія гадзіннікі Ziko. Ён таксама выкрадаў кашалькі і мабільнікі з падсобак. Здабытыя ад продажу скрадзенага грошы траціў на наркату.

• **Скралі «хуткую».** Малады чалавек катаў сяброў на скрадзеным аўто па начным Гродне, уключаў сірэну і мігалкі, спяваў у гукаўзмацняльнік песні. За ноч яны накруцілі больш за дзвесце кіламетраў. Нецвярозага згоншчыка спыніў прапаршчык міліцыі Валерый Лапошка. Заблакаваўшы машыну, ён уварваўся ў салон «хуткай дапамогі».

**СМ**

# Крывавая трагедыя ў Пінску

Працяг са старонкі 1.

Пры адсутнасці вентыляцыі ў памяшканнях невялікіх памераў (мукамольны цэх, прадпрыемства па перапрацоўцы цукру, вугальная шахта) шчыльнае воблака пылу любога гаручага рэчыва можа выбухнуць. Такі выбух здольны бурыць сцены з прычыны вялізнай плошчы кантакту рэчыва з кіслародам. За долі секунды ўспыхвае надзвычай вялікі аб'ём. А падчас вытворчасці паліўных гранул (пелетаў) сыравіну для іх (пілавінне, кару і г.д.) расціраюць да кансістэнцыі мукі.

У прамысловых аб'ёмах пелеты робяць, апроч Пінска, Лідская мэблевая фабрыка, «Мазырдрэў», «Гомельдрэў», «Магілёўдрэў», «Мастоўдрэў», «Рэчыцадрэў».

У МНС сцвярджаюць, што раней падобных здарэнняў на вытворчасці пелет не бывала.

26 кастрычніка пецярых моцна пацярпелых ад выбуху перавялі з Пінска ў апёкавы цэнтр брэсцкага абласнога шпіталя, а сем чалавек — у апёкавую рэанімацыю Мінскага гарадскога шпіталя хуткай дапамогі, паведаміў намеснік галоўнага доктара Пінскай цэнтральнай бальніцы Андрэй Навумчык.

Кіраўніцтва «Пінскдрэва» выказала спачуванні сем'ям пацярпелых. Таксама «Пінскдрэў» узяў на сябе выдаткі на пахаванне ахвяраў выбуху. Іх сем'і атрымаюць па 10 мон рублёў матэрыяльнай дапамогі. Пацярпелыя — па 3 млн рублёў. Апроч таго, яны атрымаюць страхоўку, паведамляе «Вечерний Брест».

**Генеральны дырэктар ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў» — Ларан Арыніч**

Ён узначаліў прадпрыемства яшчэ ў савецкія часы — у далёкім 1983. Сёння «Пінскдрэў» — найбуйнейшы беларускі вытворца мэблі, а таксама фанеры, запалак, ДСП, піламатэрыялаў. Акрамя непасрэдна вытворчасці ў Пінску, у холдынг уваходзіць філіял мэблевая фабрыка «Пінскдрэў–Заслаўе», сельскагаспадарчы філіял «Пінскдрэў–Бобрык», фірмовая рознічная сетка ў Беларусі.

Ларан Арыніч уваходзіць у праўленне Бізнэс–саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў і з'яўляецца старшынёй Рэспубліканскага клуба дырэктараў. Ён ганаровы грамадзянін горада Пінска і ганаровы член Маскоўскага клуба беларусаў.

**У тым цэху пылюка заўжды стаяла сцяной.**

Работнікі пінскай фабрыкі кажуць, што ў тым цэху пылюка заўжды стаяла сцяной. Паводле іх словаў, вентыляцыйнае абсталяванне на прадпрыемстве састарэла, а рабочыя цэха, дзе адбылася трагедыя, не раз звярталі на гэта ўвагу кіраўніцтва холдынга «Пінскдрэў». Аднак рэакцыі не было. Ні кіраўніцтва, ні органаў нагляду.

Папярэднюю заяву МНС аб парушэннях у вытворчым працэсе на «Пінскдрэве» каментаваць катэгарычна адмаўляюцца. З прыёмнай дырэктара прадпрыемства Ларана Арыніча журналістаў адсылалі ў аддзел працы з кліентамі.

Пракуратура Пінска распачала крымінальную справу па ч. 2 арт. 302 «Парушэнне правілаў бяспекі на выбухованебяспечным прадпрыемстве».

**Алесь Пілецкі**

**Цэх пасля выбуху.**



**Драўняныя гранулы (пелеты)**

вырабляюцца шляхам прасавання здробненай драўніны без якіх–небудзь дабавак і клею. У якасці злучаючага рэчыва выкарыстоўваецца лігнін, які пластыфікуецца пры высокай тэмпературы. Па вонкавым выглядзе пелеты — цыліндрыкі дыяметрам 6–8 мм і даўжынёй да 5 см. У Беларусі ў невялікіх аб'ёмах іх робяць шмат дзе. Абсталяванне для вытворчасці пелетаў каштуе ад $150 тыс. Пелеты даюць вельмі добрае паліва — з утрыманнем попелу ўсяго 1—3% і якое дае ў паўтара разу больш цяпла, чым дровы. Галоўная праблема пры вырабе пелетаў — сушка сыравіны. Пажаранебяспечнасць — адна з галоўных рызыкаў вытворчасці.

## Спачування ад Лукашэнкі не было

На момант здачы нумара ў друк, калі маштабы здарэння ў Пінску былі зразумелыя, кіраўнік дзяржавы ні словам не абмовіўся пра яго. Не выказаў спачуванні родным і сем'ям пацярпелых. Прэс-служба прэзідэнта не была ў стане адказаць, ці рыхтуецца такая заява.

# Дзе знаходзяцца 2,5 мільёна галасоў выбаршчыкаў?

Наўздагон Далі Грыбаўскайце піша **Уладзімір Падгол**.

Мінулы тыдзень на прэзідэнцкіх тэлеканалах прайшоў пад знакам візіту прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайце і падпісанай дамовы аб спрошчаным пераходзе мяжы паміж Літвой і Беларуссю.

Моц прапагандысцкай машыны дыктатара была такой магутнай, што некаторыя жыхары паверылі ў сапраўднасць падпісаных пагадненняў і паперлі пехам праз мяжу без ніякіх дазволаў.

Але ж, каб пагадненне пачало дзейнічаць, патрэбная яго ратыфікацыя заканадаўчымі органамі і затым падпісанне прэзідэнтамі. А пры канцы эйфарычных рэпартажаў аб падпісанні гістарычнага пагаднення прэзідэнцкія пагудчыкі сціпла паведамлялі пра тое, што яно пачне дзейнічаць, можа, летам 2011-га.

І ў цені інфармацыйнай буры засталося тое, што такое ж пагадненне падпісанае з Польшчай у лютым 2010-га, з Латвіяй — у жніўні. Польскі сойм ратыфікаваў пагадненне аб спрошчанай мяжы, і прэзідэнт падпісаў яго яшчэ да чэрвеня 2010-га, а беларускі бок нічога не робіць.

А што лідары апазіцыі, якія выпінаюцца на ролі абаронцаў інтарэсаў народа і хочуць стаць кандыдатамі ў прэзідэнты? Пакуль ад некаторых — толькі асуджэнне візіту Далі, які быццам бы скіраваны на падтрымку Лукашэнкі на выбарах.

А зараз крыху палітычнай арыфметыкі.

Уступленне ў моц пагадненняў з палякамі аблегчыць візіты ў Польшчу, па меркаванні польскага боку, прыкладна 1,5 мільёна грамадзян Беларусі, з літоўцамі — 600 тысячам, з латышамі — 500 тысячам.

Гэта значыць, што за 20 еўра без візы жыхары памежнай зоны да 50 км змогуць аж да пяці гадоў ездзіць да родзічаў у Польшчу, Літву, Латвію на 50 км углыб, рабіць закупы для сябе і на маленькі бізнэс.

Памежнікі чакаюць цунамі людскіх натоўпаў на пераходах.

Але Лукашэнка чакае вынікаў выбараў і як бы кажа Захаду: «Калі прызнаеце вынікі маіх выбараў, якія «пройдуць, як у 2006-м годзе» тады мы і ратыфікуем, а я падпішу пагадненні аб спрошчаным пераходзе мяжы. А калі не — то будзе, як з прызнаннем маім парламентам Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, якое я абяцаў Крамлю два гады таму».

А чаго чакаюць кандыдаты ў кандыдаты ад падпісання пагадненняў аб спрошчаным перасячэнні мяжы?

Відаць, чакалі таго, што Даля Грыбаўскайце, майстар найвышэйшага чорнага пояса па каратэ, схопіць дыктатара за руку, кіне праз сцягно, зробіць болевы залом, тыцне пяткай у сківіцу і будзе біць ды ламаць да той пары, пакуль дыктатар не стане дэмакратам з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.



Вільня стане бліжэй, калі выбары пройдуць дэмакратычна.

Уявіце сабе, што адразу пасля 20 кастрычніка лідары апазіцыі кінулі ўсе пікеты ў памежныя раёны збіраць подпісы за патрабаванне да беларускага парламента як мага хутчэйшай ратыфікацыі падпісаных міністрамі пагадненняў і да Лукашэнкі, каб яшчэ да выбараў ён падпісаў іх. А паралельна збіраць подпісы за сваё вылучэнне. Думаю, што сімпатыі 2,5 мільёна выбаршчыкаў памежных зонаў былі б на баку нашых.

Час яшчэ ёсць. І нават калі не паспеюць падчас збору подпісаў за вылучэнне, можна разгарнуць тую кампанію падчас агітацыйнага перыяду.

Гэта значна больш эфектыўна для рэйтынгу палітыка і поспеху ў выбарах, чым падпісанне дамоваў з катамі і іншая мышына-палітычная валтузня.

# Калі б Лукашэнка гуляў у жаночы баскетбол

Што стаіць за ўльтыматумам беларускіх баскетбалістак? Піша **Сямён Печанко**.

Праз некалькі тыдняў пасля вяртання з чэмпіянату свету-2010 у Чэхіі, дзе нашы дзяўчаты сенсацыйна занялі 4-е месца (а маглі ж і 2-е ўзяць!), нацыянальная жаночая зборная па баскетболе выступіла з адкрытым лістом.

«Жахлівы ўзровень арганізацыі, уласцівы справам у адносінах да зборнай у апошнія гады, вымусіў нас задумацца пра мэтазгоднасць далейшых выступаў за нацыянальную каманду, — адзначаецца ў лісце. — Гуляць на голым энтузіязме можна год, паўтара, два, але ніяк не на пастаяннай аснове». У сваім звароце баскетбалісткі акцэнтуюць увагу на найбольш прынцыповых момантах: адсутнасць базы для правядзення паўнавартасных збораў, праблемы з якаснай экіпіроўкай у належнай колькасці і, адпаведна, сезонам года, а таксама пытанне наяўных грошай.



Ультыматум беларускіх баскетбалістак хоць і стаў досыць нечаканым, зважаючы на ажыятаж, выкліканы фенаменальным поспехам у Чэхіі, нічога новага ў сабе не тоіць. Базу для збораў каманда просіць не першы год. «Сваім вынікам мы даказалі, што маем права на існаванне», — заклікала чыноўнікаў павярнуцца тварам да баскетбола капітан зборнай Наталля Трафімава па вяртанні з Чэхіі. Размовы пра экіпіроўку вядуцца ці не з часоў трыумфу ў Італіі, дзе ў 2007 годзе наша зборная стварыла сапраўдную сенсацыю, узяўшы «бронзу». Ужо тады дзяўчаты казалі пра неабходнасць набыцця якаснай формы ад сусветных брэндаў, але як апраналіся ў форму ад літоўскай фірмы Tuta, так і апранаюцца. Грошы, грошы. Дагэтуль з галавы не выходзіць такі факт: трэнер Анатоль Буяльскі зарабіў падчас пераможнай Еўропы-2007 ажно 200 тысяч. Але няхай супакояцца зайздроснікі — гаворка не пра еўра і даляры, а пра нашыя родныя беларускія рублі. Сёлета кожная баскетбалістка зборнай атрымала ад федэрацыі баскетбола па 4,5 тысячы даляраў. Някепска? Але ў суседняй Расіі, як кажа наша зямлячка Алена Швайбовіч, у прэм'ер-лізе за адну перамогу можна зарабіць больш.

Як бачым, агучаныя ў лісце праблемы з'явіліся не сёння. Пра іх пісалася і гаварылася не раз і не два. Дык чаму ж тады справа не рушыцца з месца?

Чаму зборная, якая дасягнула такіх вышыняў насуперак усяму, дагэтуль не мае мінімальнай належнай падтрымкі з боку дзяржавы? Здавалася б, натхнёныя такім поспехам чыноўнікі ад спорту мусяць яго развіваць і замацоўваць. Баскетбольныя секцыі можна арганізаваць у любой школе, што мае спартзалу. Як і гандбол, якім беларусы славіліся не так і даўно. І валейбол. Тым больш, што гэтыя віды спорту не патрабуюць велізарных укладанняў, як у выпадку са спортам №1 у Беларусі. Натуральна, нічога кепскага няма ў тым, каб будаваць лядовыя арэны, але ці патрэбныя яны ў такой колькасці? Колькі маленькіх жыхароў Драгічына і Івацэвічаў будуць стала займацца хакеем у мясцовых палацах пры кошце камплекта формы ад $400?

Ці акупляюцца такія аб'екты, бо што казаць пра Драгічын з Івацэвічамі, калі ўжо нават Баранавіцкі лядовы палац менш чым праз год пасля здачы ў эксплуатацыю пусцілі з малатка з прычыны мільярдных запазычанасцяў?

Зрэшты, гэтая відавочная эканамічнасць баскетбола і можа быць адной з прычын чыноўніцкай абыякавасці. А што, новая баскетбольная пляцоўка — гэта не лядовы палац, на пабудове якога можна засвоіць фантастычныя сродкі... Акрамя таго, прыклад каманды Буяльскага можа выклікаць яшчэ і раздражненне. У арэны грошы ўбухалі, а хакей наш па-ранейшаму на глыбокім пад'ёме. А тут на сумесі голага энтузіязму з патрыятызмам нараджаецца каманда, здольная дасягаць вяршыняў без якой-кольвек дапамогі з боку спартыўных чыноўнікаў. Могуць узнікнуць пытанні: а навошта тады тыя ўліванні ў прывілеяваныя віды спорту ды ўласна самі чыноўнікі?

# Мы гаворым Тан Шве...

Піша **Віталь Тарас**.

Рэспубліка Саюз М'янма — так ад 21 кастрычніка гэтага года афіцыйна называецца М'янма (колішняя Бірма). Гэта, канечне, не самая выродлівая назва дзяржавы ў гісторыі.

Разам з назвай там памянялі сцяг і герб. Ніякага рэферэндуму праводзіць для гэтага не давялося. Вайсковая хунта не абцяжарвае сябе лішнімі цырымоніямі.

7 лістапада ў М'янме адбудуцца выбары прэзідэнта і парламента. Чвэрць усіх месцаў у ім рэзервуецца за вайскоўцамі. Што прэзідэнтам стане дзейны старшыня дзяржрады генерал Тан Шве, ніхто не сумняваецца. Лідарка апазіцыі — Аўнг Сан Су Чжы, дачка нацыянальнага лідара Бірмы Аўнг Сана, забітага ў 1947 годзе, за год да абвяшчэння незалежнасці краіны, — вось ужо сем гадоў застаецца пад хатнім арыштам. У 1988 годзе створаная ёй Ліга за нацыянальную дэмакратыю заваявала 80% галасоў на выбарах, дазволеных хунтай. Тады хунта проста анулявала іх вынікі. У 1991-м Су Чжы стала лаўрэатам Нобелеўскай прэміі міру, аднак улады не дазволілі ёй выехаць з краіны, каб атрымаць прэмію.

Недзе ў класе пятым настаўніца геаграфіі даручыла мне зрабіць рэферат на выбар пра адну з краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Я выбраў Бірму. Карыстаўся я тады цяжкім томам Дзіцячай савецкай энцыклапедыі. І апісанне гэтай краіны ў даліне рэк Меконг і Іравадзі, на беразе Бенгальскай затокі Андаманскага мора, дзе ў студзені сярэдняя тэмпература +24 градусы, дзе амаль увесь час ідуць мусонныя дажджы, дзе ў джунглях хаваюцца асляпляльна прыгожыя старадаўнія храмы з залатымі пагадамі, дзе сланы дапамагаюць сялянам карчаваць лес і дзе на кожным кроку можа сустрэць брытагаловых будзійскіх манахаў у вопратцы шафранавага колеру, уразіла мяне назаўжды. Як нядаўна — той факт, што манахаў вайскоўцы збівалі прыкладамі аўтаматаў, а пры выпадку і забівалі.

Хутка спадар Тан Шве стане прэзідэнтам, памяняе форму з генеральскай на цывільную. Яго будуць прымаць — і, магчыма, не толькі, як дагэтуль, у Пекіне, але і ў еўрапейскіх сталіцах. А імя Су Чжы заходнія дыпламаты будуць згадваць толькі паміж сабой, але не ў прысутнасці м'янмійскіх вайскоўцаў, каб не раздражняць іх.

Фактычна, рэжым у М'янме самадастатковы. Яму не трэба замарочвацца праблемамі ўзаемаадносін з Еўрасаюзам, правамі чалавека. Сярод суседзяў — вялікі Кітай, а таксама Тайланд, Лаос, Бангладэш, Індыя.

Так што афіцыйнаму Мінску ёсць яшчэ куды кінуць свой позірк у пошуках патэнцыйных хаўруснікаў. Між іншым, сярод асноўных прыродных рэсурсаў М'янмы ёсць нафта!

Так што не выключана, што хутка даведаемся шмат новага і цікавага не толькі пра экзатычную Венесуэлу, але і пра таямнічую М'янму. Дарэчы, адлегласць паміж гэтымі краінамі і Беларуссю мала розніца. Чым кепскі трохкутнік: Мінск—Каракас—Нейп'ідо?

**Артыкулы на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.**

# Кажуць усе, але ці ўсе данясуць

Як мінімум дзесяць кандыдатаў сабралі 100 тысяч подпісаў.

Максімальная колькасць кандыдатаў на прэзідэнцкіх выбарах была ў 1994 годзе — шасцёра. У 2001-м толькі чатыры кандыдаты змаглі сабраць неабходную колькасць подпісаў, у 2006 — таксама чацвёра.

Гэтая ж кампанія можа стаць рэкорднай. Прынамсі, дзесяць кандыдатаў кажуць, што змаглі пераадолець неабходную планку ў 100 тысяч подпісаў.

Першым у гэтым спісе стаў, натуральна, Аляксандр Лукашэнка. Людзі не бачылі ля яго пікетаў асаблівага ажыятажу, але ўжо праз два тыдні пасля пачатку кампаніі кіраўнік Беларусі прапанаваў згарнуць збор подпісаў. Бо, па ягоных словах, сабраных 600 тысяч дастаткова.

Лукашэнка тады ж зрабіў «шырокі жэст». Маўляў, распісвайцеся за ўсіх кандыдатаў. Дапамажыце ім сабраць свае подпісы.

Наўрад гэта сыграла вызначальную ролю, але амаль усе адзначаюць, што подпісы гэтым разам збіраліся свабодна. Вось і растлумач еўрапейцу адразу, што ў нас «крывавы рэжым», калі пікеты на вуліцах стаяць адкрыта.

Месяц таму давялося паназіраць за парламенцкімі выбарамі ў Швецыі, дык вонкава беларускія прэзідэнцкія выбары мала чым розняцца ад шведскіх. З адным але: калі шведскае ТВ дае слова кіраўніку краіны для выказвання па нейкім пытанні, яно адначасова дае слова і лідарам апазіцыі для данясення іх пазіцыі.

Натуральна, што важным чыннікам будзе ўключэнне апазіцыі ў склад участковых камісій, а таксама рэальнае назіранне за падлікам галасоў.

Што тычыцца лібералізацыі, то і старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына кажа, што сёлета яе ведамства не будзе строга чапляцца да кандыдатаў. Напрыклад, па гадавых даходах не фатальнай будзе памылка ў 20%.

## Новы Гайдукевіч?

Гэта дазваляе чакаць, што зарэгістраваны будуць ці не ўсе кандыдаты, што заявяць пра збор неабходных 100 тысяч. Вось ніхто не бачыў пікетаў за Віктара Цярэшчанку ці каб яго людзі абыходзілі кватэры, а ён, тым не менш, кажа, што з задачай справіўся.

Дарэчы, па апошніх заявах Цярэшчанкі падобна, што гэты чалавек цвёрда мецiць на ролю новага Гайдукевіча. Кандыдат прапаноўвае Лукашэнку пасаду прэм'ер-міністра, але пужае выбарцаў новым 1937 годам у выпадку перамогі некага з апазіцыянераў.

## Феномен Раманчука

А вось Яраслаў Раманчук са сваёй ініцыятыўнай групай у 1300 чалавек здзівіў. Раманчук не проста задэклараваў выкананне нормы, але нават на тыдзень раней спыніў збор подпісаў. Каб не растрачваць фізічныя і фінансавыя сілы.

Пра наяўнасць ста тысяч подпісаў заявілі таксама Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў, Алесь Міхалевіч і Рыгор Кастусёў. Віталь Рымашэўскі на падыходзе.



Яраслаў Раманчук месяц прастаяў у пікетах.

## Стаханаўцы-статысячнікі

Пэўны недавер выклікалі статысячныя лічбы Мікалая Статкевіча і Дзмітрыя Уса. Подпісы за іх збіралі адны і тыя ж людзі. Не надта заўважна збіралі, трэба зазначыць. Але абодва ўжо заявілі пра поспех.

Зрэшты, у 2001 годзе пра наяўнасць ста тысяч подпісаў таксама заяўляла абсалютная большасць кандыдатаў, але на выхадзе аказалася, што далі рады толькі Сямён Дамаш і Уладзімір Ганчарык, а ў рэшты кандыдатаў подпісы разышліся як сала на панскім зайцы.

Нешта падобнае можа паўтарыцца і зараз, калі справа дойдзе да здачы падпісных лістоў. Зрэшты, не факт, што рэгістрацыя насамрэч будзе залежыць ад подпісаў. Вось і Лукашэнка паабяцаў Далі Грыбаўскайце, што ўсіх кандыдатаў зарэгіструюць.

Можна выказаць меркаванне, што дзейснаму кіраўніку выгадна такая вялізная колькасць супернікаў, якія будуць расцярушваць электарат адзін аднаго. Глядзіце, яны самі паміж сабой дамовіцца не могуць, куды ім краіну давяраць, скажуць на БТ. Рэгістрацыя павінна адбыцца да 24 лістапада.

**Зміцер Панкавец**

# Рэкардсмен Павел Знавец

Былы дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання Павел Знавец уласнаручна сабраў за Яраслава Раманчука 2 655 подпісаў. Яго штодзённа можна было пабачыць у пікетах ля Камароўкі.

**«Наша Ніва»: Як людзі рэагавалі на Вашы пікеты?**

**Павел Знавец**: Добра. За Яраслава асабліва добра распісваліся. Увогуле людзі, што хочуць зменаў у краіне, распісваліся найлепш за тройку кандыдатаў: Раманчука, Саннікава і Някляева. За паэта ў апошнюю чаргу, бо людзі не ўпэўненыя, што творчы чалавек здольны якасна кіраваць краінай. За Саннікава маладыя распісвацца не вельмі хацелі. Зборшчыкаў за Цярэшчанку ўвогуле не бачыў. У Мінску някепска распісваліся за Кастусёва. Ну, ёсць у іх пэўная электаральная база. Тысяч 15 маглі сабраць, але па рэгіёнах ім было б значна цяжэй.

«Раманчук — гэта як Мядзведзеў у Расіі».

**«НН»: Дык бар'ер у сто тысяч нехта мог пераадолець?**

**ПЗ**: Думаю, што якраз Раманчук і Някляеў і пераадолелі. Не ведаю, як там у Саннікава, бо, кажуць, што ў рэгіёнах значна горш. Частка ж назбірала ў раёне 10 тысяч. Спадзяюся, што ў хрысціянскіх дэмакратаў хопіць сумлення не пісаць, што яны сабралі неабходную колькасць. А хто такі Міхалевіч? Чаму людзі павінны распісвацца за яго? Гэта самапіяршчыкі. Цяпер важна, каб Цэнтрвыбаркам зарэгістраваў тых, хто сапраўды сабраў. Калі зарэгіструе ўсіх, то гэта будзе ганебна.

**«НН»: А ў чым прывабнасць Раманчука для людзей?**

**ПЗ**: Эканаміст, малады, разумны. Прыкладна таго самага ўзроўню, што Мядзведзеў у Расіі. Наяўнасць эканамічнай праграмы была ці не найбольш вырашальным чыннікам. Лічу, што не памыліўся з кандыдатам.



**«НН»: На мінулых ці на гэтых выбарах падпісваліся лепш?**

**ПЗ**: На мінулых выбарах я працаваў у той самай камандзе. Толькі тады нас было пятнаццаць чалавек, а зараз трынаццаць. Дык у 2006 годзе сабралі 5,5 тысячы за Казуліна, а цяпер — ужо 7 тысяч. Неаспрэчна, што падпісваліся цяпер лепш. Але ж і надвор'е было сёлета спрыяльнае.

**«НН»: А як за Лукашэнку падпісваліся?**

**ПЗ**: Былі нейкія людзі. Не ведаю, паказушныя ці не. Але падпісвалася ў разы 3-4 меней, чым за сур'ёзных кандыдатаў.

**«НН»: Колькі гадзін за суткі стаялі ў пікетах, што атрымалася выйсці на такі рэкордны паказчык?**

**ПЗ**: Па дзесяць гадзін. На мяжы фізічных сілаў. Са мной працаваў такі Зміцер Камар. Ён сабраў 2300 подпісаў. Часта даводзілася стаяць пры моцным ветры... Ну, усё нармальна.

**«НН»: Якая перспектыва ў Раманчука?**

**ПЗ**: Пры нармальным выбары, калі ёсць тэледэбаты, можна было б разлічваць на перамогу. Думаю, што ўрэшце, калі будуць зарэгістраваныя Раманчук і Някляеў, то яны павінны зняцца, каб Лукашэнка застаўся ў гордай адзіноце. Але гэта пасля рэгістрацыі, цяпер яшчэ час працаваць.

**Гутарыў ЗП**

# Сяржук Семянюк: Моладзь трэба было тузаць

Сяржук Семянюк назбіраў за Рыгора Кастусёва 1100 подпісаў. Гэта пры тым, што подпісы ён збіраў толькі два першыя тыдні, а потым давялося пераключыцца на адміністрацыйную працу.

**«Наша Ніва»: Ці актыўна рэагавалі выбарцы на Вашы пікеты?**

**Сяржук Семянюк**: Актыўна! Перад пачаткам кампаніі думаў, што людзей давядзецца ўгаворваць. Аказалася ж, што не так. З выбарцамі часам не было калі нават паразмаўляць, бо выстройвалася чарга. Дык не мы нешта расказвалі пра кандыдата, а людзі, што крышку раней распісаліся за яго.

**«НН»: За Кастусёва распісваліся, бо ён супраць Лукашэнкі, ці вызначальным быў брэнд БНФ?**

**СС:** Натуральна, што было два тыпы падпісантаў. Першыя падпісваліся абы за каго, толькі не за Лукашэнку. Другія хацелі свядома паставіць свой подпіс за нашага кандыдата.

**«НН»: А ў чым была прывабнасць Вашага кандыдата?**

**СС:** Напачатку кампаніі фігура Рыгора Кастусёва была амаль невядомая. Але людзі падыходзілі да стэндаў, чыталі пра кандыдата. Самае моцнае ў Кастусёва — ягоная біяграфія. Людзі бачылі, што не было такога часу, каб Кастусёў не працаваў. У ім пабачылі нармальнага беларускага мужыка. З нармальнай сям'ёй, з нармальнай працай, што прыносіць неблагі заробак. Таму стаўленне было абсалютна прыязнае, як да свайго, кандыдата з народа.




«У Кастусёву бачаць нармальнага беларускага мужыка».

**«НН»: За каго з іншых кандыдатаў распісваліся найбольш?**

**СС:** Ведаеце, я б не вылучыў кагосьці ў лідары. За ўсіх аддавала свае подпісы прыкладна аднолькавая колькасць чалавек.

**«НН»: За Лукашэнку таксама?**

**СС:** Не сказаў бы. Вось калі прыязджала рабіць рэпартаж група з СТВ, то да зборшчыкаў подпісаў Лукашэнкі сагналі нейкіх студэнтаў. Калі тэлевізійнікі з'ехалі, то і людзі прапалі. Хачу сказаць, што частка людзей не проста падпісвалася за незалежных кандыдатаў, але яшчэ ішла да групы Лукашэнкі, каб паведаміць, што за іх падпісвацца не будуць.

**«НН»: Увогуле, якія ў Вас уражанні ад гэтай кампаніі?**

**СС:** Надзвычай пазітыўныя. Пачаў верыць у людзей. Цяпер, калі правяраем падпісныя лісты, то відаць, што шмат нас падтрымлівае пенсіянераў. Сцерлася гэтая мяжа пакаленняў. Дарэчы, што да моладзі, то калі не тузанеш, то не падыдуць. Трэба іх запрасіць да стэнда. Калі пагаворыш, то ніякіх супярэчнасцей не маюць. І з ахвотай распісваюцца.

**Гутарыў ЗП**

# Урадавае выданне дало трыбуну палкоўніку Квачкову

У «Рэспубліцы» надрукаванае інтэрв'ю з падазраваным у замаху на Чубайса.

«Чалавек, які пабываў у нас у гасцях, без перабольшанняў, асоба — выдатны сем'янін і патрыёт сваёй Айчыны», — так ахарактарызавала яго газета «Рэспубліка».

Найперш гаворка пайшла пра тую вядомую справу. «Мяне часта пытаюць, ці была ў мяне з Чубайсам размова адзін на адзін. Не было. Аднак у нас з ім адбылася такая цікавая сцэна. Я з «клеткі» ў судзе сказаў: «Чубайс, ваша месца вось тут, бо вы не дзяржаўны, а антыдзяржаўны дзеяч».

Узгадвае Квачкоў пра сваё суседства ў камеры з вядомым алігархам Міхаілам Хадаркоўскім. «Мяне завялі ў іншую камеру — там я ўбачыў Хадаркоўскага. Спачатку мы прыглядаліся адзін да аднаго, потым пачалі размаўляць і нават дыскутаваць. Адзін раз мы праспрачаліся 18 гадзін».

Шмат кампліментаў вайсковец робіць Беларусі. Квачкоў перакананы, што наша краіна далёка наперад адышла ад Расіі. «Тут адраджаецца і развіваецца дзяржава і грамадства, а ў Расіі пануе алігархічны бандытызм».

«Цяпер вялікаросы ў духоўным плане — мёртвы народ. У расійскай гісторыі былі перыяды і горшыя ў матэрыяльным плане, але такога бязвер'я, засмучэння і бязволля руская зямля яшчэ, мабыць, не бачыла», — кажа Квачкоў пра эпоху Пуціна—Мядзведзева.



Квачкоў стаіць на пазіцыях расійскага нацыяналізму і верыць у сусветную змову супраць Расіі: «Абсалютнай большасці карэнных народаў Расіі становяцца відавочнымі наступствы 20-гадовага ліберальна-нацысцкага акупацыйнага кіравання сусветнай закулісы: духоўны свет Расіі падвергнуты гвалту, краіна разрозненая, золатавалютныя запасы вывезеныя на Захад», — такі дыягназ ставіць палкоўнік сённяшняму дзяржаўнаму ладу Расіі.

Квачкоў хоць і захапляецца парадкам у Беларусі, самастойнасці беларусаў ён не прызнае: «Я малюся за саюз Вялікай, Малой і Белай Русі, якому Бог абавязкова дапаможа адрадзіцца».

Даванне дзяржаўнай трыбуны адыёзнаму вайскоўцу будзе разгледжана ў Маскве як несяброўскі крок з боку Мінска. Дарэчы, што рабіў у Мінску палкоўнік, з кім сустракаўся, невядома. Вядома, што ў Расіі ён спрабуе стварыць «Народнае апалчэнне імя Мініна і Пажарскага».

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Кастусёў кліча пад КДБ

Кандыдат ад БНФ правядзе акцыю памяці.

29 кастрычніка ля сценаў КДБ пройдзе «Пікет памяці». Акцыя адбудзецца ў апошні дзень збору подпісаў, але будзе прымеркаваная да ўгодкаў масавага расстрэлу ў турме НКВД дзеячаў беларускай інтэлігенцыі ў 1937-м. Мерапрыемства мае пачацца а 20-й гадзіне.

Дарэчы, перадвыбарная праграма Партыі БНФ прадугледжвае стварэнне новай Нацыянальнай службы бяспекі замест КДБ.

**Зміцер Панкавец**

**І прапануе нацыяналізаваць «Белтрансгаз»**

На сёння палова акцыяў ААТ «Белтрансгаз» належыць Беларусі, другая палова знаходзіцца ва ўласнасці расейскага «Газпрома». «Беларусь знаходзіцца ў сферы ўплыву расейскіх энергетычных манаполіяў. Так што фактычна нашая газатранспартная сістэма цяпер знаходзіцца ў руках замежнага ўрада. Альтэрнатывы нацыяналізацыі «Белтрансгаза» няма — гэта ёсць неабходная ўмова захавання нашай гаспадарчай і палітычнай незалежнасці», — лічыць Р.Кастусёў.

## Шэсце на Дзяды — 31 кастрычніка

У нядзелю пройдзе традыцыйнае жалобнае шэсце ў Курапаты. Яго арганізатарамі выступілі сябры Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ. Збор запланаваны ў 10:30 ля гадзіннікавага завода (станцыя метро «Парк Чалюскінцаў»). Аб 11-й калоны рушаць праспектам Незалежнасці да мемарыяла. Пачатак жалобнага мітынгу запланаваны на 14:30.

Акцыя дазволеная гарвыканкамам.

Звычайна ўдзельнікі шэсця на Дзяды нясуць з сабой бел-чырвона-белыя сцягі, а таксама новыя крыжы, каб усталяваць іх на месцах сталінскіх расстрэлаў.

# Лукашэнка просіць грошы на выбары

Новы «Мульт асобы»: Расійскі Першы канал працягвае высмейваць.

Расійскі Першы канал прысвяціў 15-ю серыю папулярнага мультфільма «Мульт асобы» персанажу, падобнаму да Аляксандра Лукашэнкі.

У чарговым выпуску Лукашэнка ўгаворвае міністра фінансаў Расіі Аляксея Кудрына выдзеліць яму крэдыт. «І пусть севодня я ніхто, і пусць твердзят цебе, што я — таво. Но! Дай мне хоць на дзень, дай мне хоць на ноч. Дай мне хоць адзін транш. І ты паймёш!» — спявае Лукашэнка, прытанцоўваючы ў кабінеце Кудрына.

Але грошай не атрымлівае і накіроўваецца да Берлусконі. «Ну ладна, ані там в Маскве все бесталковые», — угаворвае ён Сільвіа. Але і «Луіджавіч» не пагаджаецца выдзеліць Лукашэнку 100 мільярдаў еўра. Італьянец патрабуе ў беларуса бізнэс-план, якога не аказваецца.



Каралеве Лізавеце II узамен на грошы ён прапануе прыстроіць сына Чарльза мэрам Гомеля. Але і гэтая прапанова не знаходзіць разумення.

Да Ангелы Меркель Лукашэнка ж увогуле пачынае заляцацца, але чуе ў адказ, што яна ўжо замужам. Так і не дачакаўшыся ні ад каго дапамогі, герой мультфільма вымушаны зноў шукаць дапамогі ў Кудрына.

**СП, ЗП**

# Глобуса не пусцілі ні ў Саюз мастакоў, ні ў ПЭН

а Вольскага прынялі ў Саюз пісьменнікаў.

Лявон Вольскі вырашыў «легалізаваць заняткі літаратурнай дзейнасцю». Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў прыняла музыку ў шэрагі арганізацыі. Рэкамендавалі яго для ўступлення ў саюз Алесь Пашкевіч і Барыс Пятровіч. Літаратурная спадчына рок-музыкі ўвасобілася ў зборніках паэзіі «Калідор» (1993) і «Фотаальбом» (2000). У бліжэйшы час Вольскі абяцае выдаць раман, напісаны ў 1990-х.

Адначасова Вольскі падаў заяву на ўступленне ў Беларускі ПЭН-Цэнтр, але там працэдура прыняцця даўжэйшая.

А вось Адама Глобуса другі раз не прынялі ў Саюз мастакоў Беларусі.

На пашыраным пасяджэнні Рады мастаку адмовілі ў сяброўстве ў саюзе. «Абгрунтавалі тым, што я — не чалавек. Савіч сказаў: «Паэтам можаш ты не быць, а чалавекам абавязаны».

Глобус наракае, што мастакі Уладзімір Савіч, Сяргей Цімохаў і Рыгор Сітніца пакрыўдзіліся на яго за кніжку «сУчаснікі», дзе напісана і аб іх.

Глобус здзіўлены адмовай.

Падчас галасавання на бюро Саюза мастакоў і на секцыі жывапісу аднагалосна яго кандыдатуру падтрымалі. Рэкамендавалі ў саюз Глобуса Уладзімір Тоўсцік, Аляксандр Грышкевіч, Уладзімір Кожух (старшыня мастацкай секцыі).

Для пісьменніка і мастака гэта не адзіная арганізацыя, у якую яго не прымаюць. Тройчы Глобусу адмаўлялі ва ўступленні ў ПЭН-Цэнтр — таксама ў выніку асабістых канфліктаў.



NICKOLAI BOTVINNIK

**Адам Глобус любіць шакаваць.**

**Сяргей Макарэвіч**

**САЛІДАРНАСЦЬ**

# Дапамажыце маленькаму Эдуарду

унуку нябожчыка Вячаслава Дубінкі — аднаго з удзельнікаў незалежніцкага руху 1970–1990-х.

Эдуарду ўсяго 2 гады, і яго жыццё — пастаянная барацьба за сваю будучыню. Дыягназ — дзіцячы цэрэбральны параліч цяжкай формы, эпілепсія. Рэабілітацыйныя цэнтры Беларусі і Расіі не прымаюць малога праз сутаргі. Але бацькі не здаліся, знайшлі Інстытут Глена Домана ў Філадэльфіі, дзе не адмаўляюцца нават ад самых цяжкіх дзяцей. У красавіку 2010 дзякуючы дапамозе неабыякавых людзей было сабрана 7 500 даляраў, і малы атрымаў магчымасць паехаць у ЗША. Вынікі проста цудоўныя — дзіця пачало бачыць, усміхацца, прамаўляць гукі. У яго наладзілася страваванне і пачалі знікаць сутаргі. І самае галоўнае — у маленькага Эдзіка стала паволі атрымлівацца паўзці.

Чарговая паездка запланаваная на 8 снежня. І, на жаль, бацькі зноў вымушаныя прасіць дапамогі. Калі ласка, не праходзьце міма! Калі вы можаце ахвяраваць хлопчыку ўсяго 10 000 рублёў, то ўявіце, калі гэта зробяць 1 000 чалавек…

Дапамагчы можна, пералічыўшы сродкі на дабрачынны рахунак, адкрыты ў філіяле № 514 ў АСБ «Беларусбанк», УНП 100420097; МФО 153001614.

У беларускіх рублях — № 000000008

(Транзітны рахунак № 3819382102369 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

У далярах ЗША — № 840000000112

(Транзітны рахунак № 3819382109779 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

Прызначэнне плацяжу: На Дубінка Вольгу Вячаславаўну для лячэння сына Базанава Эдуарда.

Рахункі для міжнароднага перавода:
У далярах ЗША:
56 Correspondent bank: SCBLUS33
STANDARD CHARTERED BANK, NEW YORK
57 Beneficiary bank:
SWIFT Code: AKBBBY2X
Chips UID: 319438
JSSB BELARUSBANK
32, MYASNIKOVA STREET
MINSK 220050, BELARUS
59 Beneficiary:
/Acc. No. /8400010000610
Name: Olga Dubinko
REMITTANCE INFORMATION
70/ Privat Transfer
ACC at BR 514

Для паштовых пераводаў:
Атрымальнік: Дубінка Вольга Вячаславаўна
Пашпарт MP 2051911 выдадзены Савецкім РУУС г. Мінска
Адрас: г. Мінск, вул. Кунцаўшчына, 15—15
З павагай і бясконцай удзячнасцю,
Вольга, Павел і маленькі Эдуард

Больш — на сайце dcp.by

# Краіна, дзе час спыніўся

Піша **Алег Гардзіенка**.

Тут не рэкамендуецца адкрыта хадзіць па вуліцах з фотаапаратам і тым больш фатаграфаваць адміністрацыйныя будынкі. Тут мала людзей з мабільнікамі, але танныя прадукты. Гэта Прыднястроўе — рэспубліка, якой фактычна няма.

Наведаць матч Лігі Еўропы «Шэрыф» — БАТЭ было цікава не толькі з футбольнага гледзішча. Гульня мелася прайсці ў Цiраспалі — сталіцы самаабвешчанай Прыднястроўскай Малдоўскай Рэспублікі — дзяржаве, якая ўжо 20 гадоў існуе нібы ў паралельным свеце. Яна ўсіх прызнае, яе — ніхто (апроч часткова Абхазіі, Паўдн. Асеціі і Карабаха).

Самалёт-чартар з БАТЭ ляцеў да Кішынёва, бо аэрадром у Цiраспалі не функцыянуе. Каманда спынілася ў сталіцы Малдовы (у Цiраспалі ніяк не дабудуюць пяцізоркавы гатэль пры спарткомплексе «Шэрыф»), а большасць журналістаў вырашыла дабірацца да Прыднястроўя. Цікава паглядзець, чым жыве непрызнаная рэспубліка.

Дабрацца да Цiраспаля можна маршруткамі, што адпраўляюцца ад вакзала кожныя 15 хвілінаў. Адну з маршрутак спынілі проста па дарозе на вакзал. 30 леяў (прыкладна 9 тыс. рублёў) — і ты едзеш у кірунку ПМР, якой кіруе Ігар Смірноў, якому забаронены ўезд у краіны ЕС. Але, здаецца, ён з гэтай прычыны не надта бядуе.

За тры кіламетры да Бендэра (малд. Бендэр, рум. Цігіна) — КПП. Мяжа Прыднястроўя. Над КПП лунае прыднястроўскі (стары савецка-малдаўскі) сцяг: чырвоны з зялёнай паласой пасярэдзіне.



Фанаты БАТЭ запалілі фаер і ўзнялі сцягі.



Любоў да Расіі і яе кіраўніцтва падкрэсліваецца паўсюль.


Сляды ад куль засталіся ад бітвы за Бендэр у 1992 годзе.

Зверху вакзал здымаць не рэкамендуецца.



Адміністрацыя прэзідэнта Прыднястроўя.


Гісторыя Бендэра ў жалезе. Уручаюць ключы ад Бендэрскай крэпасці князю Пацёмкіну.

## З партрэтам Суворава

Праз 100 метраў — прыднястроўская мытня. Бягучы радок над будынкам мытні абавязвае дэкляраваць рэчы на суму, большую за $100.

Спыняемся каля супермаркета «Шэрыф» — карпарацыі «Шэрыф» належыць тут паўкраіны, — каб памяняць грошы. На банкнотах — партрэт Суворава (будаўнік Цiраспаля), на 200 рублях — граф Румянцаў-Задунайскі. На капейках — выява савецка-малдаўскага герба.

Надпісы на трох мовах: расійскай, украінскай і малдоўскай (кірыліцай). Усе тры — дзяржаўныя. Аднак пераважае расейская, а малдаўская, румынская амаль не ўжываецца. Прысутнічае хіба толькі на афіцыйных шыльдах. І ў песнях гурту «Марандэ» — мегапапулярнага тут.

У Цiраспалі — зусім таннае малдоўскае віно, таннейшае, чым у Кішынёве. Па 16—20 прыднястроўскіх рублёў, г.зн. 1,5—2 даляры за пляшку. Прадукты таксама вельмі танныя. Ёсць у крамах і беларускія прадукты — вафлі «Віцьба», селядцы «Санта-Брэмар».

Паводле афіцыйных звестак, у Цiраспалі пражываюць 140 тыс. чалавек, а горад выглядае на райцэнтр кшталту Шклова ці Вілейкі.

Праз горад за суткі праходзяць усяго чатыры цягнікі. Рэшта адменена. У тым ліку і Мінск — Кішынёў.

Увечары горад зусім вымірае. Вярталіся пасля прэс-канферэнцыі трэнера БАТЭ Віктара Ганчарэнкі недзе пасля 20-й, а ўражанне, што на гадзінніку недзе поўнач. Тралейбусы ад спарткомплекса «Шэрыф» перастаюць хадзіць а 19-й.

## Гатэль «Транзітны»

Яго адчынілі пры аддзяленні мытні летам, нарадусім для кіроўцаў, што праязджаюць праз горад. Адвялі пад гасцініцу другі паверх — шэсць двухмясцовых і аднамясцовы нумары. За суткі з чалавека — 15 даляраў (150 рублёў), жывеш ты адзін у нумары ці ўдвух.

У нумары ёсць тэлевізар. У ім недзе пад 20 каналаў, але сярод расійскіх, украінскіх, двух прыднястроўскіх — ніводнага малдаўскага. Відаць, каб не пасеяць зерня сумнення. Затое ўласнае прапаганды больш чым дастаткова, нават у навінах спорту. Амаль кожны з выступоўцаў (былі сюжэты пра веславанне, юніёрскі гандбол, дзіцячы тэніс) лічыў за лепшае падкрэсліць правільную і дальнабачную палітыку прыднястроўскага кіраўніцтва ў галіне спорту.

## Усеагульная падазронасць

Напружыла і значная колькасць «ціхароў» у горадзе. Падчас трэніроўкі БАТЭ празмерная колькасць «рабочых» сачыла, куды ты ідзеш. Пры тым, што рабочы дзень скончыўся — трэніроўка пачалася а 18-й.

Вось і калі падышлі да вакзала і па наведанні пачалі яго абыходзіць з іншага боку, аператыўна выйшаў супрацоўнік вакзала з сабакам і дзелавіта-строга запытаўся: «Куды ідзём?»

Тут не рэкамендуецца гуляць па вуліцах з фотаапаратам і, крый божа, здымаць будынкі дзяржустаноў, вакзала, міліцыі.

## Сеў за разгалошванне дзяржтайны

Раніцай наступнага дня пасля сняданку, што ўваходзіў у аплату за нумар (тры смажаныя яйкі, тры кавалкі хлеба і чай) выбраліся ў горад. Зайшлі ў інфармацыйнае агенцтва «Новы рэгіён — 2» — яно зарэгістраванае ў Екацярынбургу, але мае прадстаўніцтвы. Адзін з супрацоўнікаў сядзіць ад красавіка за разгалошванне дзяржаўнай таямніцы. Каму і дзе ён яе разгаласіў, невядома, бо суда яшчэ не было.

У выніку мясцовыя журналісты былі вельмі акуратныя ў сваіх ацэнках.

## Грошай на выданне няма

У Цiраспалі немагчыма не тое што купіць альбом ці кнігу пра горад або агулам аб Прыднястроўі, але і набор сучасных паштовак.

Кнігі, прысвечаныя Прыднястроўскаму канфлікту, у пачатку 1990-х разыходзіліся як гарачыя піражкі. Цяпер цікавасць зменшылася.

Пра вайну ў Цiраспалі нагадвае толькі вялікі манумент у памяць пра ахвяры. Супрацоўніца музея цішком шэпча нам: «Наламалі тады дроў з аднаго і другога боку, столькі народу паклалі. І адны, і другія вінаватыя».

## Бендэр

Адпраўляемся ў Бендэр — горад на правым беразе Днястра, што кантралюецца Прыднястроўем (Малдова ж кантралюе шэсць сёлаў на левым беразе).

Ад Цiраспаля да Бендэра ходзіць тралейбус (маршрут №19). Ехаць 20 хвілінаў. Кошт — 1 рубель 80 капеек. Тралейбусы — мінскія. Некалі наша сталіца падарыла Цiраспалю некалькі машынаў. На некаторых машынах застаўся надпіс «Мінчане — ціраспальчанам».

З 19 па 21 чэрвеня 1992 г. у Бендэры адбылася знакамітая бітва за горад, калі малдоўскія салдаты імкнуліся ўзяць горад, які заявіў пра сваю незалежнасць ад Кішынёва.

Да гэтага часу на вуліцах Леніна і Першамайскай, Суворава захаваліся дамы са слядамі ад куляў. На адной з вуліц, проста ля ходнікаў — магіла забітага. Жанчына-кіяскёрка, у якой мы спыталіся дарогу, запратэставала: «Навошта вам гэта бачыць, нам да сёння баліць».

## З удзелам партактыву

Перад заходам сонца тым жа тралейбусам вяртаемся ў Цiраспаль. Месцы для журналістаў на трыбунах знаходзяцца на ВІП-трыбуне. Білет на матч каштуе ад 2,5 да 10 даляраў, ВІП-квіток — $50, сюды ўваходзіць абслугоўванне ў бары (каньяку «Квінт» там незлічона).

За журналісцкім шэрагам — шэраг для мясцовай эліты, паводле трапнай заўвагі Сяргея Новікава з «Прессбола», — партгасактыву. Яны застаўляюць увесь свой шэраг пластыкавымі кубачкамі з каньяком. Чым бліжэй да канца матча, тым экспрэсіўнейшымі робяцца іх каментары. Апошнія тры хвіліны мат з іхняга боку ў дачыненні да беларускіх футбалістаў не сціхае.

Фінальны свісток — і стаўленне з іх боку кардынальна мяняецца. Яны віншуюць нас з перамогай, прапануюць выпіць за БАТЭ (нам нельга, мы пры выкананні), абяцаюць прыехаць у Мінск 4 лістапада.

Пасля гульні адразу выязджаем аўтобусамі ў аэрапорт Кішынёва — даволі ажыўлены. Самы папулярны кірунак — на Бухарэст, рэйсы тры разы на дзень.

Нарэшце загружаемся ў самалёт, камандзір экіпажа віншуе БАТЭ з перамогай (персанальна Сяргеяў Сасноўскага і Верамко) і за 1 гадзіну 20 хвілін далятаем да Мінска, які сустракае нас +1 градусам цяпла. У Цiраспалі ў сераду было +18—20.

## У трансе

Прыднястроўе падалося яшчэ бяднейшым, чым Малдова. Тут мала людзей з мабільнікамі на вуліцах. Што гаварыць, калі сярэдні заробак у Прыднястроўі — 150—200 даляраў.

За кошт чаго выжывае гэты анклаў? За кошт субсідый з боку Расіі. Бензін тут у паўтара разу таннейшы, чым у Кішынёве.

Па-малдаўску і на большасці еўрапейскіх моваў Прыднястроўе гучыць як «Трансністрыя». Трапнае азначэнне, краіна так і засталася ў трансе і перабывае ў ім ужо 20 гадоў.

*Кішынёў—Цiраспаль—Мінск*

Аўтар дзякуе ФК БАТЭ за дапамогу ў стварэнні матэрыяла.

# «Масакра» апраўдала чаканні

Журналіст «НН» пабачыў стужку Кудзіненкі на прэс-паказе.

Гэта стужка «Беларусьфільма», але гэта не «Беларусьфільм». Гэта нешта кардынальна новае па стылістыцы і задачах.

Містыка, лёгкая эротыка, беларускія легенды. Хтосьці назваў гэта «бульба-хорар». Няўдала. Проста «новае беларускае кіно».

Хаця ў фільме героі размаўляюць на беларускай, польскай, але больш расейскай мовах, гэта чыста беларуская стужка, з’ява беларускай культуры, як фільмы Кустурыцы — з’явы культуры сербскай.

У савецкія часы экранізавалі творы Караткевіча, Мележа, Адамчыка, але большасць тых стужак беларускімі былі толькі па прыналежнасці аўтараў. «Масакра» адкрывае ў гэтым сэнсе новы аспект.

Падзеі «Масакры» адбываюцца ў Беларусі ў 1860-х гадах, пасля паўстання Каліноўскага. Край здранцвеў пасля тэрору. Забаронена трымаць нават стрэльбы. А госці графа Пазуркевіча, генерал і яго сын-вайсковец, усяляк прыніжаюць тутэйшых. Малады афіцэр называе «польскія» шаблі нікчэмнымі ў параўнанні з расейскімі. І атрымлівае ад гаспадара па азадку гэтай шабляй, што прыводзіць афіцэра ў шаленства.

Сюжэт фільма выбудоўваецца вакол любоўнага трохкутніка: граф Пазуркевіч — Ганна — Мікалай Казанцаў.

У палац да графа Пазуркевіча прыязджае малады мастак Мікалай Казанцаў, які выдае сябе за прафесара з Пецярбурга. Авантурыст збіраецца каталагізаваць рэдкую бібліятэку, за што разлічвае зарабіць грошай на вучобу ў Венецыі. А ў палацы рыхтуюцца да вяселля Уладзіміра Пазуркевіча з маладой Ганнай. Але аказваецца, што жанчына стала каханкай Казанцава. Яна просіць нерашучага маладога чалавека звезці яе ад графа, якога ўжо зусім і не кахае.

Пазуркевіч, прадчуваючы здраду, забівае ўсіх гасцей. Але сам гіне ад рукі мастака-авантурыста. Ганна ў выніку не становіцца нічыёй жонкай, а вар’яцее.

Сюжэт просты. Калі не лічыць, што Уладзімір Пазуркевіч ператвараецца ў мядзведзя. Гэтую ролю, дарэчы, іграў сапраўдны мядзведзь па мянушцы Сцёпа.

Акрамя мядзведзя, у фільме зняліся расейскія акцёры Дзмітрый Мілер (Пазуркевіч), Андрэй Назімаў (Казанцаў), Марыя Кудраневіч (Ганна), беларусы Настасся Зелянкоўская, Алег Гарбуз, Сяргей Журавель, Аляксандр Колбышаў... Рэжысёр — Андрэй Кудзіненка, сцэнарыст — Аляксандр Качан.




Бюджэт жа фільма склаў пяць мільярдаў беларускіх рублёў. Гэта робіць карціну адной з найдаражэйшых у гісторыі беларускага кінематографа. Усё добра, калі б не дэвальвацыя. Як кажуць асобы, блізкія да Кудзіненкі, грошай усё ж не хапіла на належных камп’ютарныя эфекты. Зрэшты, стужка ўсё адно глядзіцца ідэальна.

27 кастрычніка ў кінатэатры «Кастрычнік» адбудзецца закрыты паказ фільма. 7 лістапада пройдзе глядацкі прагляд у межах кінафестывалю «Лістапад», а 11-га першы фільм новай эры беларускага кіно чакае нацыянальная прэм’ера.

**Кастусь Матушыч**

НОВЫЯ КНІГІ

## Як беларус вырашыў праблему харчавання астранаўтаў




**У Мінску 21 кастрычніка прайшла прэзентацыя кнігі-святапіса «Сонца тваё не закоціцца, і месяц твой не схаваецца», прысвечанай айцу Аляксандру Надсану. Зала Акадэмічнай бібліятэкі была перапоўненая. У духоўным плане айцец Надсан для незалежнае беларускае грамады адыгрывае ролю, параўнальную з той, якую для тыбетцаў — Далай-лама. У інтэлектуальным плане яго ўнёсак у развіццё палітычных і гуманітарных даследаванняў Беларусі грандыёзны.**

Пра другі выпуск альманаха «Асоба і час» піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Што я ведаў пра генерала Кіпрыяна (Цыпрыяна) Кандратовіча? Не больш за тое, што прачытаў у чацвёртым томе Энцыклапедыі гісторыі Беларусі ды ў тэкстах дзеячаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Цяпер я ведаю нашмат больш, бо ў другім выпуску беларускага біяграфічнага альманаха «Асоба і час» прачытаў нарыс Леаніда Лаўрэша «Генерал Кіпрыян Кандратовіч: крэскі да жыцця».

Няшмат я ведаў і пра жыццёвы шлях аднаго з пачынальнікаў беларускага руху Антона Неканды-Трэпкі, а яшчэ менш — пра асяроддзе, з якога ён паходзіў (ну, хіба тое, што ён быў пляменнікам Янкі Лучыны). Цяпер і пра Антона Неканду-Трэпку я ведаю значна больш, бо ў тым самым выпуску альманаха «Асоба і час» змешчаны нарыс Ганны Запартыкі «Антон Люцыян Неканда-Трэпка: Старонкі жыцця».

Як вядома кнігалюбам і гісторыкам, летась выдавецтва «Лімарыус» выдала першы выпуск альманаха «Асоба і час». Меркавалася, што ён будзе выходзіць штогод. Аднак сёлета раней свет убачыў трэці — адмысловы — выпуск, прысвечаны сотым угодкам з дня нараджэння Ларысы Геніюш, а зусім нядаўна — другі, ардынарны выпуск.

Аўтары пішуць пра людзей, якія жылі і працавалі ў Беларусі ў даўні, новы і найнавейшы час. У альманаху ўдзяляецца таксама месца дзённікам, успамінам і ліставанню.

Калі першы выпуск альманаха адкрываўся прадмовай ад рэдакцыі, дык у другім выпуску ў якасці перадавога змешчаны артыкул архівісткі Вольгі Івановай «Асабістыя архівы беларускай нацыянальнай эліты ў канцы XVIII — пачатку XX стст.».

Калі ў першым выпуску ў рубрыцы «Водгулле стагоддзяў» Іван Саверчанка пісаў пра эпоху Жыгімонта Старога ў беларускіх хроніках, дык цяпер той самы аўтар адступіў у часе далей і напісаў пра імперыю Вітаўта Вялікага.

У гэтай рубрыцы мяне не магла не зацікавіць і публікацыя гісторыка Царквы, крыніцазнаўцы Дзяніса Лісейчыкава, які надрукаваў тастамент мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і ўсяе Русі Іосіфа Вельяміна Руцкага. Каштоўнасць публікацыі ў тым, што раней быў вядомы няпоўны тэкст гэтага дакумента, напісаны да таго ж на лаціне. Цяпер гісторыкі маюць магчымасць прачытаць поўны тэкст тастамента архіўладыкі Іосіфа IV на мове арыгіналу — старабеларускай.

Новыя рыскі да жыццяпісу Адама Багдановіча знойдзем у артыкуле Сямёна Букчына «Мой задушэўны прыяцель...»: Максім Горкі і Адам Багдановіч». А Таццяна Ільіна і Аляксандр Фядута пішуць пра аднаго з філаматаў — Вінцэнта Будрэвіча («Будрыс в Твери»).

Ведама, я не магу назваць усе матэрыялы, змешчаныя ў другім выпуску альманаха «Асоба і час», але мушу адзначыць, што ў раздзеле «Пачнём збіраць зярно к зярняці...» надрукаваны ў поўным сэнсе сенсацыйны артыкул Лявона Юрэвіча «Чалавек, які трымаў у руках Месяц». У гэтым артыкуле апавядаецца пра доктара Аўгена Вярбіцкага — беларуса, які па вайне скончыў Тэхналагічны ўніверсітэт у Мюнхене, а потым апынуўся ў Злучаных Штатах. Гэты чалавек вырашаў праблему харчавання амерыканскіх вайскоўцаў у паходных і палявых умовах, калі нельга карыстацца звычайнай ядой. І праблему харчавання астранаўтаў. У падзяку за гэта астранаўты падарылі яму дробны кавалачак Месяца. Выяўляецца, не толькі Барыс Кіт меў дачыненне да развіцця амерыканскае астранаўтыкі. Лявон Юрэвіч згадвае ў сваім артыкуле і іншых беларусаў, якія папрацавалі дзеля навукова-тэхнічнага прагрэсу ў ЗША.

Каб агляд быў больш поўны, трэба абавязкова адзначыць, што да рубрык «Водгулле стагоддзяў», «Абрысы дзён мінулых» і «Радаводнае дрэва» ў другім выпуску альманаха «Асоба і час» дадалася новая — «Юбілейнае». У гэтай рубрыцы Сяргей Харэўскі друкуе артыкул пра, бадай, самага выдатнага архітэктара СССР сталінскай эпохі Івана Жалтоўскага, Міхась Скобла публікуе ўспаміны і сваю ўжо даўнавату гутарку з Максімам Лужаніным, а Сяргей Шапран — лісты і прысвячэнні Уладзіміра Караткевіча Рыгору Барадуліну.

Аб матэрыялах у рубрыцы «Пачнём збіраць зярно к зярняці...» я ўжо напісаў, але звяртаю на яе асаблівую ўвагу: як відаць з трох выпускаў, гэтыя словы Песняра могуць быць дэвізам альманаха «Асоба і час».




**Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 2** / Укладальнік Аляксандр Фядута. — Мінск: «Лімарыус», 2010.

### Сцісла

**• Экскурсія «Па сядзібах Эдварда Вайніловіча».** У Капыльскім раёне з’явіўся новы экскурсійны маршрут. Ён уключае наведванне руін сядзібы «Лапухі» ў вёсцы Дунаева, якая належала Вайніловічу. На сродкі ад яе продажу ў 1903 годзе будаваўся Чырвоны касцёл. Экскурсія праходзіць і праз рэшткі радавога маёнтка Вайніловічаў — сядзібу «Савічы», якая належала сям’і з XVI стагоддзя.

**• Шансон зрабіў касу «Славянскаму базару».** Прыбыткі сёлетняга фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» перавысілі выдаткі на Br332,5 млн. Спрыяла, паводле арганізатараў, тое, што на фестываль былі запрошаныя Дзмітрый Хварастоўскі, Стас Міхайлаў, спевакі-шансанье. На «Славянскі базар-2010» было выдзелена Br2,5 млрд з рэзервовага фонду прэзідэнта і амаль 25 млн расійскіх рублёў — са сродкаў саюзнай дзяржавы.

**• Катынская трагедыя: забітыя 1226 афіцэраў з Беларусі.** Тэлеканал «Белсат» зняў дакументальны фільм «Катынь. Праз 70 гадоў». Гісторык Ігар Кузняцоў сцвярджае ў ім, што трацiна з расстраляных польскіх афіцэраў з’яўлялася ўраджэнцамі Беларусі (1126 з 4421). У фільме ставіцца пытанні, чаму сярод соцень спаленых фашыстамі вёсак для мемарыяла ўлады выбралі сугучную з Катынню Хатынь і чаму дакументы пра катынскую трагедыю застаюцца пад грыфам «сакрэтна».

**СМ**

# Князёўна Гедройць: Жорж Санд медыцыны

**Род Гедройцяў, паходжаннем з Беларусі, даў свету не толькі знакамітага рэдактара парыжскай «Культуры» Ежы Гедройця. Лёс яго сваячак, князёўнаў Веры і Раісы, здольны ўразіць нават абыякавага чытача. Піша Алег Дзярновіч.**

Жыццё Веры Гедройць было напоўненае экзотыкай, а то і выклікам — нават па нашым часе.

Бацька Веры, Ігнацы, амаль падлеткам узяў удзел у паўстанні 1863 г. Таму вымушаны быў пакінуць радзіму. Каталіцкай шляхце забаранілі набываць зямлю на тэрыторыі былога ВКЛ, Ігнацы здолеў асесці толькі ў Расіі. У маёнтку Слабадзішча Арлоўскай губерні ў 1870 у Ігната Гедройця і нарадзіліся сын Сяргей і дачка Вера.

Маладосць князёўны несла на сабе адбітак эпохі — праз прыхільнасць да левых ідэй і ў агульным настроі на ідэі эмансіпацыі жанчын. За сатырычны верш яе выключаюць з гімназіі ў Арле. У Санкт-Пецярбургу, дзе Вера вучылася на Вышэйшых медычных курсах, яна трапіла ў поле зроку паліцыі. За ўдзел у рэвалюцыйным гуртку яе ў 1892 выслалі ў маёнтак бацькі пад нагляд паліцыі.

Каб вырвацца, Вера Гедройць бярэ фіктыўны шлюб з афіцэрам Мікалаем Белазёравым і з новым пашпартам таемна з'язджае за мяжу. У Лазане князёўна паступае на медыцынскі факультэт мясцовага ўніверсітэта. І, як высвятляецца, медыцына была яе прыродным заняткам. Яна вучылася ў вядомага хірурга Цэзара Ру.

Але бунтарны ліцвінскі дух, сімпатыя да левых ідэй не абяцалі стабільнага жыцця. Справы сям'і прымушаюць яе вярнуцца ў Расійскую імперыю — памірае сястра, а хворы бацька просіць дачку прыехаць да родных.

У 1902 Вера Гедройць пацвярджае свой дыплом у Маскоўскім універсітэце і пачынае працаваць лекарам. Да неафіцыйнага тытула адной з першых жанчын-хірургаў у Еўропе дадаецца вызначэнне першай жанчыны-хірурга ў Расіі.

Правінцыйныя шпіталі Калужскай воласці Вера ператварае ў шматпрофільныя хірургічныя цэнтры. Падчас расійска-японскай вайны яна па лініі Чырвонага Крыжа накіравалася на фронт і адна з першых у гісторыі медыцыны пачала рабіць у палявых умовах паласныя аперацыі — раней жаўнераў, параненых у жывот, проста пакідалі паміраць.

Доктар Гедройць стала медыйнай фігурай, пра яе пісала прэса, яна была заўважаная пры царскім двары. Тады ж Вера разарвала фіктыўны шлюб, вярнула сабе тытул князёўны і дзявочае прозвішча.

У 1909 князёўна атрымала запрашэнне імператрыцы стаць хатнім лекарам дзяцей цара. Гэтае прызначэнне было непрыхільна прынятае ў царскім атачэнні, а ў далейшым у князёўны Гедройць склаліся напружаныя адносіны з Рыгорам Распуціным і Ганнай Вырубавай, фрэйлінай імператрыцы, якая пасярэднічала ў зносінах Распуціна і імператарскай сям'і. Падобна, не толькі ідэйна-палітычныя разыходжанні спрычыніліся да гэтага.

### Вера як Сяргей

Пераезд у Царскае Сяло і кантакты з пецярбургскім асяродкам правакуюць Веру Гедройць да яшчэ аднаго творчага занятку. Тут, у імперскай сталіцы і ў царскім атачэнні, яна знаёміцца з літаратарамі расійскага «Срэбнага веку»: Гумілёвым, Івановым-Разумнікам, пазней і з Ясеніным.

Вера Гедройць сама пачынае пісаць. Першая яе кніга «*Стихи и сказки*» выклікала адмоўную ацэнку Гумілёва. Але князёўна-хірург засталася ў багемным коле і прыняла прапанову таго ж Гумілёва ўвайсці ў створаны ім «Цэх паэтаў», пад эгідай якога выходзілі наступныя кнігі Веры Гедройць. Але ад пачатку, ад першай сваёй кнігі ў 1910, Вера Гедройць выступала ў літаратурным друку пад алонімам (імем брата-нябожчыка) Сяргей Гедройць.

### Вайна і рэвалюцыі

Першая сусветная вайна заспела доктара Гедройць на пасадзе галоўнага лекара Царскасельскага шпіталя. Яна пераабсталявала палацавы шпіталь для прыёму параненых. Доктар Гедройць навучала рамяству медсясцёр — імператрыцу Аляксандру і яе дачок Вольгу і Таццяну. Потым яны былі яе асістэнткамі падчас аперацыяў.

Пасля ж Лютаўскай рэвалюцыі 1917 на доктара Гедройць як на асобу, набліжаную да царскай сям'і, пачынаецца ціск новых уладаў і камісараў Часовага ўрада. У маі 1917 доктар Гедройць назаўжды пакідае Царскае Сяло і скіроўваецца на фронт. Пасля ранення яна апынаецца ў Кіеве.

Там у 1923 яна робіцца прафесарам медыцыны, а ў 1929 абіраецца загадчыцай кафедрай на факультэце хірургіі Кіеўскага медычнага інстытута. Так падазрона стабільна не магло развівацца жыццё савецкіх падданых, асабліва з ліку інтэлігенцыі. У 1930 у рамках працэсу «Саюза Вызвалення Украіны» (аналага акцыі супраць «Саюза Вызвалення Беларусі») Вера Гедройць была звольненая з універсітэта без права на пенсію.

### Асабістае жыццё

Апошнія гады Вера Гедройць пражыла ў Кіеве разам з графіняй Марыяй Нірад, з якой стварыла лесбійскую сям'ю. У 1920-я гэта было цалкам рэальна, у той час савецкая ўлада ўзяла курс на ліквідацыю шлюбу як грамадскага інстытута і талеравала альтэрнатыўныя формы сужыцця.

Выглядае, што князёўна Гедройць імкнулася да такой ролі даўно. Таму яе так раздражнялі нечасаныя валасы Распуціна і яго брутальныя паводзіны — яна бачыла сябе лепшым мужчынам. Яшчэ ў даваенны перыяд яе звалі «Жорж Санд Царскага Сяла» — як і французская раманістка, яна мела падкрэслена мужчынскія звычкі ў вопратцы і побыце.

Яе знаёмая па Кіеве Аўдзіева прыгадвала каларыт асобы прафесара хірургіі: «Вялікая, трохі мажная, яна апраналася па-мужчынску. Насіла пінжак і гальштук, мужчынскія капелюшы, футры з бабровым каўняром. Стрыглася каротка. Для яе росту рукі і ногі ў яе былі замалыя, але надзіва прыгожыя. Рысы твару — сухаватыя і занадта тонкія для мажнай фігуры — падчас усмешкі маладзелі». Яшчэ пісалі, што пра сябе яна казала ў мужчынскім родзе: «Я пайшоў, я апераваў, я сказаў».

Дзеці Мары Нірад, якія жылі з імі, адчувалі непрыхільнасць да Веры Гедройць, бо «іхняя маці моцна пагарджала мацярынскімі абавязкамі, аддаючы ўсе свае думкі і час Гедройць, медыцынскай справе (яна была ў Веры Ігнатаўны хірургічнай сястрой) і справам царкоўным».

Сама медык, Вера не змагла пазбегнуць смерці ад хваробы. У яе быў дыягнаставаны рак на апошніх стадыях, і ў 1932-м яна пайшла з жыцця. Веру Гедройць пахавалі на Спаса-Праабражэнскім (сёння Карчаватцкім) цвінтары Кіева, дзе яе магілу яшчэ доўга дагладалі пацыенты, якіх яна выратавала.



**Княжна Вера Гедройць (справа) і імператрыца Аляксандра ў перавязачнай Царскасельскага шпіталя, 1915 г.**

**Гедройці ў ВКЛ**

Сваё паходжанне Гедройці вядуць ад вялікага князя літоўскага Тройдзеня. Яго род, зафіксаваны ў позніх генеалагічных легендах як род Кітаўруса (ці Гіпацэнтаўра), панаваў у Літве напярэдадні «роду Калюмнаў» (Гедымінавічаў). Таксама Гедройці былі ў фаворы за часамі Соф'і Гальшанскай, жонкі Ягайлы, і біскупа Мельхіёра Гедройця, які даў прытулак Мацею Стрыйкоўскаму, першаму гістарыёграфу Вялікага Княства.

Імем Ежы Гедройця названа вуліца ў Мінску.

Пра Раісу Гедройць, аўтарку песні «В лесу родилась ёлочка», — публікавалі ў «НН» №38.


ЗБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў














Бубка-малодшы таксама гуляе ў тэніс.

СПОРТ

# Беларуска заваявала Крэмль

і прызналася ў рамане з Сяргеем Бубкам.

Матчы на «Кубак Крамля» ў Маскве для тэнісісткі Вікторыі Азаранкі былі важныя, бо ў выпадку ўдалай гульні яна мела шанцы трапіць на выніковы турнір у катарскую Доху. Там збіраецца васьмёрка наймацнейшых спартовак года, а беларуска была толькі дзясятай.

Гэты сезон ёй не надта заладзіўся, мучалі траўмы. Вельмі часта даводзілася здымацца з турніраў не праз паразы, а па стане здароўя.

Да маскоўскага ж турніру Віка падышла ў выдатнай форме. Яе перавага над апанентамі не выклікала сумневаў. У фінальным паядынку беларуска выйграла ў гаспадыні кортаў Марыі Кірыленкі.

А яшчэ ў Маскве Азаранка шакавала ўсіх, калі назвала імя свайго бой-фрэнда — Сяргей Бубка. Тактак, многія адразу падумалі, што гаворка пра славутага ўкраінскага атлета па скачках з шастом.

Насамрэч дзяўчына казала пра яго нага 23-гадовага сына. Бубка-малодшы таксама гуляе ў тэніс, але не так паспяхова, як Азаранка. Украінец у рэйтынгу знаходзіцца толькі ў трэцяй сотні.

**Зміцер Панкавец**

# Акадэмія навук: Беларусы — ніякія не балты і схільныя да глухаты

Складзены генетычны партрэт беларуса. Афіцыйны.

Пра гэта паведаміў загадчык лабараторыі нехрамасомнай спадчыннасці Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Алег Давыдзенка. Даследаванне па этнагеноміцы беларускага народа праводзілася ў 2005—2006 гадах. Было вывучана каля тысячы проб ДНК карэнных беларусаў шасці геаграфічных раёнаў: паўночнае Падзвінне, заходне-ўсходняе Палессе, цэнтральная, усходняя і паўночна-заходняя Беларусь.

«Асноўны вынік даследаванняў: беларусы — гэта індаеўрапейцы, славяне (і ніякія не балты). Самыя блізкія сваякі да нас па колькасці генетычных сістэм — гэта расейцы і ўкраінцы. Бліжэй за ўсё да гэтай групы славян стаяць балты, наступныя — германцы», — сказаў Давыдзенка.

Як лічыць Давыдзенка, калі вынікі даследавання супаставіць з гістарычнымі, археалагічнымі, геалагічнымі звесткамі, можна зрабіць выснову, што засяленне Беларусі пачалося прыкладна восем тысяч гадоў таму. «Мы з'яўляемся прамымі нашчадкамі тых людзей, якія 8 тысяч гадоў таму засялілі краіну», — сказаў вучоны.

Па большасці генаў схільнасць беларусаў да хвароб такая ж, як і ў Еўропе. Але некаторыя гены, напрыклад тыя, што абумоўліваюць глухату, у Беларусі сустракаюцца часцей. Акрамя таго, кожны 22-гі беларус мае «шкодную прыкмету», якое адказвае за развіццё гемахраматозу (спадчыннага хранічнага захворвання, якое характарызуецца парушэннем абмену жалеза).

Гісторыкі ўжо скрытыкавалі вывады пра «прамых нашчадкаў» як цемрашальскія. Большасць нацый фармавалася ў выніку складанага змяшэння этнасаў.

Варта адзначыць, што генетычныя прыкметы можна класіфікаваць паразнаму, таму існуюць і працы, якія даказваюць генетычную блізкасць беларусаў з украінцамі і балтамі. Расійскія ж генетыкі выявілі роднаснасць большасці славянаў ад Масквы да Славеніі. Цікава, што выяўна розніца ад іх паўночнарасійская папуляцыя, блізкая да фіна-вуграў.

**БелаПАН; Сяргей Гезгала**



## Памёр васьміног Паўль

26 кастрычніка ў акварыуме «Зеелайф» нямецкага Оберхаўзена памёр знакаміты васьміног Паўль, што падчас Чэмпіянату свету па футболе ў Паўднёвай Афрыцы правільна адгадаў усе вынікі зборнай Нямеччыны і назваў чэмпіёна і бронзавага прызёра. Пасля гэтага Паўль зрабіўся маскультурнай з'явай.

Беларускія жартаўнікі прапаноўвалі, напрыклад, каб ён адгадаў вынікі прэзідэнцкіх выбараў.

Прапаў ён, відавочна, ад старасці: галаваногія малюскі доўга не жывуць.

**АГ**

КОЛЫ

## Кіроўцы BMW — самыя агрэсіўныя

Як паказвае даследаванне, самымі агрэсіўнымі кіроўцамі ў Вялікабрытаніі з'яўляюцца ўладальнікі аўтамабіляў BMW. Больш за палову апытаных аўтамабілістаў назіралі нахабныя паводзіны баварскіх машын на дарозе.

У апытанні ўдзельнічалі больш за тры тысячы чалавек. Цікава, што 17% удзельнікаў даследавання сутыкаліся з грубасцю на дарозе цягам апошняга тыдня.

**КаМ, паводле The Telegraph**

НАВУКА

## Шведы навучыліся штучна састарваць віно

Спецыялісты шведскай машынабудаўнічай кампаніі Electrolux навучыліся састарваць віно да патрэбнага тэрміну за кароткі час. Прылада, якая атрымала назву Wave Ultra Sonic Wine Ager and Refrigerator, усталяваная ў своеасаблівай «лядоўні», зможа давесці віно да патрэбнага ўзросту за некалькі гадзін за кошт уздзеяння магнітнага поля. Сапраўдным знаўцам якаснага віна новая тэхналогія наўрад ці спадабаецца.

**КаМ, паводле wsj.com**




ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## Мадэль, не ідзі ў бардэль!

Акцыю пад такім лозунгам зладзілі 19 кастрычніка актывісткі ўкраінскага жаночага руху Femen. Яны слаўныя тым, што з дапамогай уласнае галізны прыцягваюць увагу грамадства да важных тэмаў. Прычым робяць гэта ў публічных месцах. Выходзіць часам двухсэнсоўна.

Гэтым разам дзве напаўаголеныя дзяўчыны з плакатамі «Мадэль, не ідзі ў бардэль» і «Подыум — мясная лаўка» вырваліся на той самы подыум падчас Украінскага тыдня моды. Пасля дэфіле ахова праводзіла актывістак да гардэроба ды прасачыла, каб яны апрануліся і сышлі.

**Сяргей Мікулевіч**

## У Ісландыі прайшла масавая забастоўка жанчын

Тысячы жанчын Ісландыі пратэстуюць супраць няроўнага ўзроўню сярэдняй зарплаты мужчын і жанчын. У панядзелак супрацоўніцы, што пратэстуюць, сышлі з працы роўна ў 14:25. Многія з іх таксама адмаўляюцца рыхтаваць абед ці вячэру, прыбіраць дома і нават даглядаць дзяцей.

Сярэдні заробак жанчын у Ісландыі складае прыкладна 65% заробку мужчын. Таму, лічаць арганізатары страйка, цалкам лагічна сысці з працы, прапрацаваўшы прыкладна 65% працоўнага дня.

Гэта ўжо чацвёрты такі страйк за апошнія 35 гадоў. Усеагульныя забастоўкі жанчын праходзілі ў Ісландыі ў 1975, 1985 і 2005 гадах.

**Бі-Бі-Сі**

КАЛЬКУЛЯТАР

## Кожную секунду ў свеце адпраўляюць 200 тысяч SMS-аў

Паводле прагнозаў спецыялістаў, да канца года колькасць абанентаў сотавай сувязі ў свеце дасягне 5,3 млрд. У развітых дзяржавах рынак мабільнай сувязі дасягнуў насычэння: на 100 жыхароў прыпадае 116 купленых SIM-картак.

Сярэдні кошт аднаго паведамлення складае ў свеце ў сярэднім $0,07. Такім чынам, кампаніі сотавай сувязі зарабляюць толькі на SMS $14 тыс. за секунду.

**СМ**




## БАТЭ ў Мінску

**Матч «Шэрыф»—БАТЭ ў групавым турніры Лігі Еўропы пройдзе 4 лістапада ў Мінску. Першую гульню ў Ціраспалі БАТЭ выйграў з лікам 0:1.**

**Становішча камандаў пасля 3-х тураў: БАТЭ — 7 (2, 1, 0, 7—3) Дынама — 4 (1, 1, 1, 4—5), AZ — 3 (1, 0, 2, 4 -7), Шэрыф — 3 (1, 0, 2, 3—3).**

## КАНЦЭРТЫ

### Крама

**27 кастрычніка ў Jack club (вул.Няміга, 12)** — канцэрт гурта «Крама». **Пачатак а 21-й.**

### Шапэн

**27 кастрычніка а 19-й у Вялікай канцэртнай зале Філармоніі (пр.Незалежнасці, 50)** — канцэрт Яна Кшыштафа Броя, прысвечаны святкаванню года Фрэдэрыка Шапэна.

### Ісландскі гурт Mezzoforte

**10 лістапада а 19-й у Вялікай зале КЗ «Мінск»** — канцэрт гурта Mezzoforte (jazz-rock, funk-fujion). Mezzoforte — ісландскі калектыў, які грае мікс з фанка, джаз-року і ф'южн.

### Метал у «Рэактары»

**3 лістапада ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) а 18-й** — канцэрт **Sabaton** (Швецыя), **Alestorm** (Шатландыя), **Steelwing** (Швецыя). Спецыяльны госць — **Litvintroll**.

### Легенды Вялікага Княства

**30 кастрычніка а 19-й у Палацы культуры ветэранаў (вул.Купалы, 21)** — канцэрт-прэзентацыя дыска «Легенды Вялікага Княства». Бяруць удзел **Testamentum Terrae**, **Cornucopia**, **«Яварына»**, тэатр **«ДыГрыза»**, **«Гістрыён»** і іншыя.

## ВЫСТАВЫ

### Грунвальд

**Ад 3 да 21 лістапада ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3)** працуе выстава «Грунвальд», прысвечаная 600-годдзю перамогі войскаў ВКЛ і Польшчы над тэўтонцамі.

### Паводле часу

**27 кастрычніка а 17-й у Вялікай зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці,47)** адкрываецца персанальная выстава мастака Сяржука Цімохава «Паводле часу». Яна будзе працаваць да 14 лістапада.

### Карціны Юдаля Пэна ў Мінску

**У Музеі Якуба Коласа да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

### Выстава твораў Барыса Заборава

**Ад 26 кастрычніка да 10 снежня ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. У савецкія часы ён быў запатрабаваным кніжным графікам. Сам выбіраў кнігі, якія яму афармляць. А з'язджаў у Францыю, каб вучыцца далей. У савецкай Беларусі ён не бачыў перспектывы і прагрэсу. Быў, праўда, і ціск з боку спецслужб, звязаны з даносамі калегаў. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Збораў лічыць па-іншаму. «Беларусь — мая радзіма. Я пражыў тут першую палову жыцця. Але вучыўся я ў Расіі. За апошнія дваццаць гадоў Расія праявіла да мяне вялізны інтарэс... Францыя — таксама мая радзіма. Таму ідэя грамадзяніна сусвету для мяне заўжды была блізкай і сімпатычнай. А калі б я назваў сябе беларускім мастаком, гэта была б няпраўда». Карціны Барысы Заборава выстаўляюцца ў лепшых музеях свету. У Беларусі захоўваюцца яго раннія працы. Летась Нацыянальны мастацкі музей атрымаў першую карціну Заборава, створаную ўжо ў Францыі. Гэта палатно «Гумно».

### Выстава плакатаў Яфіма Тараса

**У памяшканні Саюза дызайнераў** Беларусі адбудзецца імпрэза памяці Яфіма Тараса — беларускага мастака-графіка, бацькі пісьменніка Валянціна Тараса і дзеда публіцыста Віталя Тараса. Яфім Тарас нарадзіўся 25 мая 1910 года ў Мінску. Скончыў славутую мастацкую вучэльню ў Віцебску, але большую частку жыцця пражыў у сталіцы Беларусі. У 1981-м яго не стала. У творчай спадчыне мастака — мастацкае афармленне і ілюстрацыі да кніг Янкі Купалы, Якуба Коласа, твораў Аляксандра Пушкіна ў перакладзе на беларускую мову і іншых. У 50-я — 60-я гады мінулага стагоддзя Яфім Тарас стварыў мноства арыгінальных плакатаў, якія за савецкім часам выконвалі функцыю сацыяльнай і побытавай рэкламы. Працы для юбілейнай выставы ласкава надаў Саюз дызайнераў Беларусі, які сабраў і зберагае багатую калекцыю айчыннага плаката. На вернісаж запрашаюцца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй сучаснага мастацтва. **Адрас Саюза дызайнераў: вул.Брылеўская, 14 (уваход з двара).** Можна даехаць аўтобусамі №40, 53, 100 да прыпынку «Гатэль «Спадарожнік».

### Юбілейная выстава Алеся Шатэрніка

Выдатны беларускі скульптар, аўтар Звана Свабоды Алесь Шатэрнік адсвяткаваў сваё 70-годдзе 16 кастрычніка. Да гэтай нагоды **14-га ў Літаратурным музеі (вул.Багдановіча, 13, гэта ў Траецкім прадмесці)** адчынілася ягоная юбілейная выстава «Сонцапрамень. Жывапіс. Скульптура. Імпрэсія».

### Выстава супраць смяротнага пакарання

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** працуе выстава «Смерць — гэта не праваСуддзе». Выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць адмененае.

### Гербарый часу

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці 47) да 30 кастрычніка** — выстава «Гербарый часу». Увазе гледачоў прапануюцца творы жывапісу і графікі маладых мастакоў Таццяны Казанцавай, Ірыны Ясюкайць-Дударавай, Таццяны Грыневіч і Соф'і Піскун.

## ІМПРЭЗЫ

### Паходжанне славян

**29 кастрычніка ў Беларускім ПЭН-Цэнтры ў 18.45** адбудзецца семінар навукова-краязнаўчага таварыства «Загароддзе». Тэма: «Паходжанне славян». Дакладчык: Хведар Клімчук. **Адрас на рагу дзвюх вуліц: вул. Залатая Горка, 2-101 (па вул. Казлова дом мае нумар 7).** Гэта насупраць кінатэатра «Мір».

## ТЭАТРЫ

### 27 кастрычніка

**Лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»
**Імя Горкага** — «Бег»
**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

### 28 кастрычніка

**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Беларускай драматургіі** — «Чарнобыльская малітва»
**Імя Янкі Купалы** — «Паўлінка»
**Імя Горкага** — «Сунічная паляна»

### 29 кастрычніка

**Лялек** — «Пэпі-Доўгаяпанчоха»
**Імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Імя Янкі Купалы** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Імя Янкі Купалы** — «Вечар»
**Оперы і балета** — «Тоска»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

### 30 кастрычніка

**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Оперы і балета** — «Тоска»
**Беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»

### 31 кастрычніка

**Імя Горкага** — «Каштанка»
**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Лялек** — «Пэпі-Доўгаяпанчоха»
**Беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Оперы і балета** — «Тоска»

### 1 лістапада

**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

### 2 лістапада

**Юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Імя Горкага** — «Бег»
**Беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Оперы і балета** — «Марная перасцярога»

### 3 лістапада

**Юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Лялек** — «Пэпі Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі** — «Вячэра з прыдуркам»
**Беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Оперы і балета** — «Марная перасцярога»

### 4 лістапада

**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Імя Горкага** — «Дзева і смерць»
**Беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

### 5 лістапада

**Лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»

### 6 лістапада

**Юнага гледача** — «Бармалей»
**Лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Імя Горкага** — «Каштанка»
**Оперы і балета** — «Шчаўкунок»
**Імя Горкага** — «Васа»

### 7 лістапада

**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»

## КІНО

### Найлепшы сябра дзяўчыны — кулямёт

**РЭД** (RED)
ЗША, 2010, каляровы, 111 хв.
**Рэжысёр:** Роберт Швэнтке
**Ролі выконваюць:** Брус Уіліс, Мэры-Луіз Паркер, Морган Фрымен, Джон Малкавіч
**Жанр:** Іранічны баявік паводле коміксаў Уорэна Эліса і Калі Хамнера
**Адзнака:** 7 (з 10)




Фрэнк Мозэс — агент у адстаўцы, які круціць раман з супрацоўніцай пенсійнага фонду. Пасля Мозэса спрабуюць забіць, пагражаюць і ягонай каханцы. Былы агент збірае старую каманду і адпраўляецца на прыгоды.

Карціна Роберта Швэнтке — радасны і бадзёры баявік з харызматычнымі персанажамі. Нязменны «моцны арэшак» Брус Уіліс, закаханая няўмека (Паркер), для якой свіст куляў — найлепшая музыка, элегантная Хелен Мірэн з кулямётам, ЦРУшны псіхапат Джон Малкавіч... І нязменна-мудры Морган Фрымен.

Роберт Швэнтке даводзіць публіку да параксізмаў рогату. Немагчыма забыць двубой на гранатамётах і жаночыя плёткі за снайперскаю вінтоўкай. Ну і візіт у расійскую амбасаду.

Карціна — спалучэнне прыгодаў і іроніі, лёгкіх жаночых мараў і крутога баевіка.

**Андрэй Расінскі**

# «Маг» супраць «Персіла»

Айчынны пральны парашок: эксперымент «НН».

Большасць людзей, якія куплялі замежны пральны парашок, ніколі не купяць айчынны. Чаму? Таму што пабайваюцца: менавіта такі парашок звычайна ўяўляецца як той страшны «звычайны» ці «танны» з рэкламы, які псуе адзенне.

У памяці тых, хто застаў савецкія часы, яшчэ жывы кашмарны парашок «Сумгаіт», які адрозніваўся ад сумесі крэйды і соды толькі цёмным колерам і страшэнным пахам.

«НН» рашыла высветліць, ці варта баяцца сучасных айчынных парашкоў.

Яны танныя, але бяруць іх горш, чым любыя іншыя. Самым вялікім попытам карыстаюцца расійскія ці польскія аналагі заходніх парашкоў. Прычым расійскі парашок з фірмовай этыкеткай бяруць лепш, чым беларускі.

Чаму так адбываецца? Прадавачкі лічаць, што ўсё праз рэкламу: паспрабуйце ўключыць тэлевізар і не ўбачыць парад пральных парашкоў: пры тым адзін з іх будзе, як у старым жарце, найлепшым у Еўропе, другі — найлепшым у свеце, а трэці — найлепшым у гэтым рэкламным блоку.

Ці апраўданая перадузятасць да беларускіх парашкоў? Журналіст атрымаў заданне купіць адзін з парашкоў «Бархіма» і паставіць «эксперымент».

Мы выбралі дзве белыя баваўняныя кашулі і дзве пары джынсаў (пакалашмачаных, якіх было не шкада). Для забруджвання ў ход пайшло ўсё, што знайшлося ў хаце, — ад шарыкавай ручкі да кавы і ўручную выціснутага на кашулі цытрынавага соку.

Першым парашком быў бархімаўскі «Маг». Вынік: толькі плямка ад лімона праяўлялася пасля мыцця (але ж у жыцці такія плямкі сустракаюцца рэдка — мы палівалі ад душы).

Другім заходам пайшоў адзін з «фірмовых» парашкоў, зроблены ў Расіі, а дакладней — «Персіл». Вынік аказаўся такі самы — засталася толькі плямка лімона. Ні кавы, ні асадкі, ні чаю, ні бруду, якія «бралі ўдзел» у эксперыменце, не засталося.

Розніца знайшлася там, дзе мы яе не чакалі: каўнер і манжэты. Якраз бархімаўскі парашок адчысціў каўнер і манжэты лепш, чым расійскі.

Адрозненняў паміж беларускім парашком і дарагім польскім мы выявілі два:

1) Беларускі парашок не мае парфумных дабавак, якія б стваралі прыемны пах адзенню. Але тут варта заўважыць, што не ўсім гэты пах даспадобы, а большасць ім увогуле не цікавіцца.



ЮРАСЬ УСКОЎ

2) Цана. Розніца ў кошце — вялізная.

Бархімаўскі «Айсберг» каштуе 3000 за 500 грамаў, у той час як нават расійскі парашок з самых танных — 6000, а цэны польскага часцяком перавышаюць лічбу 10 000.

Напрыклад, у мінскім ЦУМе бархімаўскі «Айсберг» каштуе 3000 рублёў, «Тайд», «Лоск» і «Персіл» знаходзяцца ў адной і той жа катэгорыі — прыкладна 6000 рублёў, а парашок «Міф» можа дацягваць і да 7000. Гаворка ідзе пра пакунак у 450, час ад часу (у залежнасці ад маркі) 500 грамаў.

Парашкі «Бархіма» знойдзеце ў крамах. А вось рынкі не бяруць беларускіх парашкоў на рэалізацыю, бо няма рэкламы.

Каб даведацца, чаму ж ніякай рэкламы ў якаснага беларускага тавару няма, мы звязаліся з кіраўніцтвам «Бархіма». Але на заводзе даваць хоць якія-небудзь каментары пра ўласную прадукцыю адмовіліся. Што ж, пры такім падыходзе...

**Юрась Ускоў**

# Беларускі хлеб:
## ад «бабінага» да «мужчынскага»

У савецкія часы са словам «хлеб» спалучаліся два прыметнікі: «учорашні» ці «сённяшні». Гэта былі або паляніца, або «брыкецік» — той самы брыкецік, які цяпер шмат каму падаецца смачнейшым за ўсе астатнія. Цяпер жа маем хлябоў — на выбар.

Турысты беларускім чорным хлебам захапляюцца, асабліва прадукцыяй сталічных пякарань.

Як патлумачыла нам галоўны тэхнолаг «Мінскхлебпрама» Ніна Лушчык, усе сем хлебазаводаў Мінска маюць свой асартымент.

Самыя папулярныя сарты хлеба на сёння: «Водар», «Нарачанскі» і «Майскі». Яны розныя па сваіх смакавых якасцях, але не надта дарагія — гэтым і тлумачыцца іх папулярнасць. А таксама тым, што рэцэптура іх збіралася па вёсках, таму, напрыклад, «Нарачанскі» самі хлебапёкі называюць «бабчыным». Дарэчы, ён жа — адзін з першых заварных хлябоў, што пачалі прадукавацца ў Беларусі. Іншы — досыць спецыфічны «Барадзінскі», які таксама паспеў набыць шмат аматараў.

Што тычыцца хлеба «з разынкай» (тут у пераносным сэнсе), то і выбар такога ў нас багаты. Кожны хоць раз купляў «Траецкі» хлеб. Ён адносіцца да хлябоў дэсертнага тыпу — ёсць варыянты з курагой, разынкамі і арэхамі. Такі хлеб разлічаны не на ўжыванне разам з супам. Хутчэй «самадастатковы» хлеб, які можна падаваць да гарбаты. Дарэчы, нядаўна з'явіўся «Траецкі-чэмпіён» з кунжутам і насеннем сланечніка, лёну і гарбуза.



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Калі размова зайшла пра хлеб да гарбаты, сам сабой узгадаўся таставаны хлеб, а таксама знакаміты міф, што ад яго можна вельмі хутка растаўсцець. Так, у тоставы хлеб дадаюць той самы «паляпшальнік», што і ў Еўропе. Гэта розніць яго ад звыклага хлеба. Але, каб не таўсцець, трэба проста ведаць меру ў яго паяданні.

### Чым здзівіць гасцей

Пра беларускі хлеб у суседніх краінах ведаюць. Вось топ-3 спецыфічных хлябоў, якімі можна прыемна здзівіць замежніка.

1. «Радзівілаўскі» — хлеб са шматлікімі дабаўкамі, у рэцэптуру якога ўваходзяць тры найменні квасу. Памер бохана і вага гэтага хлеба ўражвае — 2,4 кілаграма. Існуе ў сувенірным пакунку з фамільным гербам Радзівілаў. Гэты заварны хлеб можна есці і як гарнір, і як асобную страву. Ён смачны і ў бутэрбродах. Яго важная асаблівасць — застаецца свежым два тыдні.

2. «Юбілярны» — яшчэ адзін хлеб, рэцэпт якога быў прывезены з вёскі. Гатуецца ён на кляновым лісце, ад гэтага мае спецыфічны прысмак і дасканала пасуе да многіх страваў, асабліва супоў беларускага тыпу.

3. «Вясковы з салам». Што ў ім незвычайнага, зразумела з назвы. Гэта цяжкі, але вельмі сытны хлеб, які хлебапёкі называюць «мужчынскім», — пад'ясі такога зранку, і да вечара ходзіш сыты.

**ЮУ**

**Самыя папулярныя хлябы ў Мінску**

«Водар»

«Нарачанскі»

«Майскі»

**Топ-3 спецыфічных хлябоў**

«Радзівілаўскі»

«Юбілярны»

«Вясковы з салам»

**Сапраўдная беларуская кухня**

### Баба на скорую руку да кавы

Узбіць разам 10 яек, 1 шклянку вяршкоў, 80 г дражджэй, 1 шклянку масла, 1 шклянку цукру, дробна насечаную цэдру лімона або трохі горкага міндалю, кілішак віна і муку, якой трэба ўзяць столькі, каб цеста выйшла, як на вафлі. Узбіваць трэба паўгадзіны. Выліць цеста на патэльню, змазаную маслам і абсыпаную цёртымі сухарыкамі, паставіць у цёплае месца, каб цеста паднялося, пасля чаго выпякаць у печы.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка» (1854) падрыхтавала НБ**

**Прыватныя абвесткі**

**ВІТАННІ**

**Юрасік — наш ДОКТАР!** Віншуем цябе З ДНЁМ НАРОДЗІНАЎ! Зычым табе магутнага здароўя, найлепшых падзей, удачы ў жыцці! Сябры з Харугвы.

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Фільм «Беларуская быль» на DVD** («Номфільм», нязвыклая трактоўка падзей Другой сусветнай вайны) прадам. Т.: (029) 332-69-56. Святлана.

**Выйшла кніга «страдацельных» песень** «Жорсткі раманс» (недаследаваны жанр у беларускай фалькларыстыцы). 435 старонак. Жадаючым набыць: (029) 672-03-75.

**Прадам нядорага метадычную літаратуру** для настаўнікаў беларускай мовы. Т: (029) 276-15-98.

Прадаю Біблію за 5000 рублёў. Т.: (0212) 25-80-79.

**ПРАЦА**

**Беларускамоўная дзяўчына шукае беларускамоўную працу!** Пра сябе: вышэйшая лінгвістычная адукацыя (нямецкая, англійская, троху французская і польская), досвед працы тры гады ў якасці перакладчыка і сакратара. Т.: (029) 778-68-36. Зацікаўленым дашлю рэзюмэ.

**Падпрацоўка для студэнткі або пенсіянеркі,** якая цікавіцца беларускай літаратурай і музыкай. 15.00—19.00 на будні. Т.: (029) 615-47-76, (029) 279-47-76.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

# Кемікі

1) У адной палкі 2 канцы. Колькі канцоў будзе ў дзесяці палках з паловай?

2) Як у пакоі паставіць два крэслы, каб каля кожнай сцяны стаяла па крэсле?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Век Чырвонага касцёла

1910—2010. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Без яго немагчыма ўявіць Мінск. Лёс Чырвонага касцёла сугучны лёсу нацыі ў апошняе стагоддзе.

Яго падарылі Мінску Эдвард Вайніловіч і яго жонка Альбіна. У канцы XVIII ст. у Мінску было 15 касцёлаў ды 5 уніяцкіх цэркваў. А праз сто гадоў застаўся ўсяго адзін. У 1903 г. вернікі паставілі дзве тысячы подпісаў пад заявай аб патрэбе будаўніцтва новай святыні.

Міравы суддзя, стацкі дарадца, дэпутат расійскай Дзярждумы, шматгадовы старшыня Мінскага сельскагаспадарчага таварыства Эдвард Вайніловіч узяўся ўзвесці касцёл за прыватны кошт у памяць сына Сымона, які пражыў толькі 12 гадоў. Пакуль чынавенства разглядала заяву мінскіх вернікаў, Вайніловічаў напаткала яшчэ адна трагедыя: памерла іх 18-гадовая дачка Алена-Бянігна. Вайніловічы вырашылі пабудаваць касцёл у гонар святых Сымона і Алены — як памятку па сваіх дзецях.

У камітэт для кіравання будаўніцтвам новага касцёла, апроч Вайніловіча, увайшлі такія шанаваныя ў Мінску асобы, як гарадскі галава М.Валовіч, ксёндз А.Ака, графы Любанскі і Чапскі.

Праектаваць новы касцёл Вайніловіч даручыў прускаму архітэктару Тамашу Пайздэрскаму. Выява створанага ім храма неараманскага стылю ў прускім Ютрасіне трапілася на вочы фундатару і надзвычай яго ўразіла.

Узоры ўсіх дэталяў, нават завесы і клямкі на дзверы, падрыхтаваў сам Пайздэрскі, каб вытрымаць цэласнасць стылю. Але прускі грамадзянін не меў права будаваць касцёлы на тэрыторыі Расіі. Таму рабочая дакументацыя праекта была зробленая ў майстэрні Уладзіслава Марконі з Варшавы, а фармальныя правы даручаныя тутэйшаму інжынеру Ф.Барановічу.

Будаўніцтва пачалося ў маі 1906 г. і вялося фірмай «Гай-Свянціцкі&Co». Сучаснікі дзівіліся з якасці будаўнічых работ. Дыхтоўную чырвоную цэглу прывозілі аж з Чанстаховы, а дахоўку — з Улацлаўка. Для калонаў і алтароў быў падрыхтаваны ружовы пясчанік і мармур з Польшчы.

Вежа-званіца касцёла Сымона і Алены стала самым высокім збудаваннем тагачаснага Мінска. А сам ён — найбольшым храмам у горадзе.

Дзень 21 лістапада 1910 г. стаў сапраўдным святам горада, натоўп гараджанаў сышоўся на зовы званоў «Міхала», «Эдварда» і «Сымона», што веставалі пра асвячэнне новага храма.

Дарэчы, Вайніловіч спрыяў беларускаму руху. Ён сябраваў з Раманам Скірмунтам, сустракаўся з Іванам Луцкевічам, добра ведаў Вацлава Іваноўскага, ахвяраваў грошы на «Нашу Ніву». Вайніловіч падтрымаў утварэнне БНР, удзельнічаў у пасяджэнні яе Рады.

Лёс Чырвонага касцёла сугучны лёсу нацыі ў апошняе стагоддзе.

З прыходам бальшавікоў касцёл прыстасавалі спачатку пад Польскі тэатр БССР, а пасля — аддалі пад кінастудыю.

У часе Другой сусветнай вайны храм быў вернуты парафіі. Пробашчамі ў ваенны час былі а.Вінцэнт Гадлеўскі і а.Станіслаў Глякоўскі, якіх нацысты расстралялі ў Трасцянцы за ўдзел у незалежніцкім падполлі.

Антон Шукелойць, у часе вайны дырэктар Гістарычнага музея, вярнуў у касцёл абраз Божай Маці ў стылі мадэрн: з краявідам Мінска, касцёлам і ўкленчанымі дзецьмі Вайніловіча. З гэтым абразом у музеі за саветамі была праблема: людзі на яго жагналіся...

Пасля 1945 г. у касцёле зноў была кінастудыя. На другім паверсе зрабілі павільёны, куды для здымак усцягвалі і машыны, і коней... Тут здымалі стужкі «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Дзяўчынка шукае бацьку» — кінакласіку БССР.

Рабіліся спробы цалкам знішчыць святыню. У 1960-я былі распрацаваны праект самага вялікага ў Мінску шырокафарматнага кінатэатра на месцы Чырвонага касцёла. Кажуць, перашкодзілі пратэсты інтэлігенцыі. Яшчэ кажуць — касцёл не ўзарвалі, бо баяліся пашкодзіць Дом урада...

У 1970-я ў Чырвоным касцёле размясціўся Дом кіно. Мастак Гаўрыла Вашчанка зрабіў вітражы, што ўвасаблялі алегорыі пяці мастацтваў. Мастак згадваў: аб'ект прымалі Машэраў, Кісялёў, Кузьмін, іншае начальства. Быў пахмурны і ветраны дзень. Сонца выбліснe — вітражы як зайграюць! Машэраў казаў сваім паплечнікам з ноткай пакаяння: «Ну, бачыце, а мы хацелі разбурыць такую каштоўнасць!»

Ва ўтульных глядзельных залах партыйныя работнікі праглядалі заходняе кіно — на прадмет эротыкі і гвалту. Вызначалі, што можна паказваць народу, а што не...

А ў канцы 1980-х у Чырвоным касцёле адбылася знакавая падзея нацыянальнага вызвалення: 19 кастрычніка 1988 г. у дольнай зале храма было ўтворанае Таварыства памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій «Мартыралог Беларусі». А пры «Мартыралогу» — аргкамітэт па стварэнні Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне» на чале з Зянонам Пазняком. Прысутны на пасяджэнні супрацоўнік ЦК хацеў сарваць абвяшчэнне, але, дзякуючы цвёрдасці Васіля Быкава, гэта не ўдалося.

У 1990 г. святыня была аддадзеная вернікам. Дзякуючы велізарным намаганням пробашча Уладзіслава Завальнюка і ўсёй парафіяльнай грамады, касцёл стаў цэнтрам рэлігійнага жыцця і асветы.

Цяпер богаслужбы тут ідуць і ў рымскім, і ў грэцкім абрадах. І тут я хрысціў сваю дачку, якой, як падрасце, я буду расказваць пра гэты храм багата дзіўных гісторыяў... А гісторыя пруска-польска-беларускага храма не скончаецца: помнік рэдактару газеты «Звязда», што ля касцельнай агароджы, Амельянюку, будзе перанесены на другі бок. А на яго месца, ужо асвечанае, паставяць помнік Яну Паўлу II. А скульптуру Арханёла Міхала перанясуць на месца «Звона Нагасакі», што будзе таксама перамешчаны... Суцэльны калазварот. Але гэта і ёсць жыццё...

«Я не жадаў спыняцца на гатычным стылі, бо [ён] вельмі адрозніваўся ад стылю праваслаўных храмаў ігэтым як бы падкрэсліваў падзел у веравызнанні класаў нашага грамадства, і я спыніўся на раманскім стылі, росквіт якога прыпадае на час, калі ўсходняя Царква існавала ў еднасці з Рымам».

**З успамінаў Эдварда Вайніловіча**

## Анекдоты

* * *

Самалійскія піраты захапілі танкер з украінскім экіпажам. Грошы для выкупу сваіх дзецюкоў збірае ўся Самалі.

* * *

Па статыстыцы, 70% наведнікаў лазні забываюцца памыцца, аднак 90% з іх пра гэта зусім не шкадуюць.

* * *

Кожны выбірае тую рэлігію, якая найлепш апраўдвае яго недахопы.

* * *

Доўгае падарожжа заўсёды пачынаецца са слоў: «Я ведаю кароткую дарогу».

* * *

Канібалізм у свеце жывёлаў: суседскі кот Барсік з задавальненнем зжэр набытую гаспадарамі шаўрму.

* * *

Цікава, чаму грошы, якія адкладаюцца на «чорны дзень», выдаткоўваюцца на вяселле?

* * *

Чавес перадаў Лукашэнку падарунак ад Пуціна — торфабрыкет. І цёплыя словы: «газ» і «нафта».

* * *

Раўнівая бландзінка, пераглядваючы спіс кантактаў у асьцы мужа:

— Хто такая Дзіма?

## «НН» сто гадоў з вамі

**Дзвінск.** Сяляне ў вёсцы Ужгальдзе выгналі ўрадніка і стражнікаў, выламалі дзверы ў турме і ўвольнілі арыштантаў, кажучы, быццам тамака зачыненыя былі нявінныя.

**«НН». № 41. 1910.**

**У студыі забароненага «Радыё 101.2»** скончаны запіс супольнага альбома беларускіх рок-музыкаў «Я нарадзіўся тут». NRM, Kriwi, Аляксандар Крывашэеў-Пәмідораў, а таксама мецэнат і ініцыятар стварэння альбома «Святы вечар — 2000» Алесь Суша (гаспадар бутыка «Camilla» на пр.Машэрава) амаль падрыхтавалі да выдання новы супольны праект, які мае складацца з рымэйкаў беларускай патрыятычнай класікі.

**«НН». № 44. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**

1) 22 канцы; 2) Пастаўце крэслы ў два супрацьлеглыя куты.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.10.2010.
Замова № 5216.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10040